

НЕ ПРЫЁМНЫЯ — РОДНЫЯ

Сямейная газета

ЖЫЦЦЁВЫЯ ДАРОГІ ПІЛІПА ПЕСТРАКА 15






Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

19 СТУДЗЕНЯ 2023 г. ЧАЦВЕР № 11 (29891)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Ігар БУЗОЎСКІ, намеснік міністра інфармацыі:**

*«Інфармацыйная бяспека сёння вельмі важная і актуальная не толькі для вузкапрофільнай дзейнасці асобных галін міністэрстваў і ведамстваў, але і для ўсёй дзяржавы і кожнага чалавека ў прыватнасці. Неабходна напрацоўваць медыяадукаванасць не толькі праз метадычныя дапаможнікі, але і праз зносіны са спецыялістамі, абменьвацца вопытам. Кожны карыстальнік інтэрнэту — гэта ўдзельнік інфармацыйнага поля. Таму важна разумець, што адбываецца ў сетцы, ведаць, як правільна дзейнічаць і адстойваць свае інтарэсы ў інфармацыйным полі».*

# Вада на Вадохрышча



Фота БелТА.

**Як паведамляюць сіноптыкі, з-за плюсавой тэмпературы і ападкаў узровень вады ў буйных беларусіх рэках блізкі да небяспечнага. Прыпяць, Дняпро, Бярэзіна, Сож, Заходняя Дзвіна ўжо выйшлі з берагоў на пойму. Вось-вось цалкам пазбавяцца лёду хуткаплынныя Нёман і Вілія... На гэтым фота работнік ратавальнай станцыі Гомельскага АСВОДа Кірыл МАНАННІКАЎ мерае ўзровень вады на затопленым Сожам участку ў ваколіцах абласнога цэнтра.**

## КОРАТКА

• **Дзіцячыя дамы-інтэрнаты за час акцыі «Нашы дзеці» атрымалі дапамогу на Br450 тысяч.**

• Міністэрства аховы здароўя: выпадкаў заражэння амікрон-штамам каранавіруса «кракен» у Беларусі пакуль няма.

• **Экспазіцыі Брэсцкай крэпасці абсталююць тактыльнымі таблічкамі для наведвальнікаў, якія слаба бачаць.**

• Узровень вады на Прыпяці каля Мазыра наблізіўся да небяспечнага высокага значэння.

• **У Віцебскай вобласці самазанятыя грамадзяне ў 2022 годзе павялічылі ўклад у бюджэт больш за 80 працэнтаў.**

• У Камітэт дзяржаўнага кантролю летась паступіла больш за 250 паведамленняў аб заробках у канверце.


ISSN 1990 — 763X

23011


Эканоміка

## СТАЎКА РЭФІНАНСАВАННЯ — ХУТКА 11,5 %

### Гэта паказчык запаволення інфляцыі

**Такім чынам, 23 студзеня стаўка рэфінансавання зніжаецца з 12 % да 11,5 % гадавых. Гэта рашэнне прынята праўленнем Нацыянальнага банка па выніках пасяджэння па грашова-крэдытнай палітыцы.**

Таксама зніжаецца стаўка па крэдыце авернайт — з 13 % да 12,5 % гадавых, стаўка па дэпазіце авернайт — з 11 % да 10,5 % гадавых.

У Нацбанку растлумачылі, што ў апошнія месяцы назіраецца ўстойлівае запаволенне інфляцыі. У снежні 2022 года гадавы прырост спажывецкіх цэн склаў 12,8 %, агрэгаваны паказчык трэндавай інфляцыі — 10,2 % гадавых. Такая дынаміка спажывецкіх цэн станоўча адбіваецца на інфляцыйных чаканнях эканамічных агентаў. У адпаведнасці з вынікамі апытанняў чаканая насельніцтвам у наступныя 12 месяцаў інфляцыя ў снежні 2022 года зменшылася да 12,6 % — з 14 % у верасні 2022 года.

У цэлым, паляпшэнне інфляцыйных чаканняў насельніцтва спрыяе захаванню прытоку рублёвых сродкаў у банкаўскую сістэму. Разам з тым на фоне зніжэння працэнтных ставак дэпазітнага рынку, які адбыўся адначасова з памяншэннем ставак крэдытнага рынку, ашчадная актыўнасць застаецца стрыманай, у тым ліку ў сілу павышаных інфляцыйных чаканняў. У гэтых умовах, з улікам чаканага далейшага запаволення інфляцыі, праўленнем Нацыянальнага банка прынята рашэнне аб зніжэнні стаўкі рэфінансавання на 50 базісных пунктаў.

Наступныя рашэнні па стаўцы рэфінансавання Нацыянальны банк будзе прымаць з улікам фактычнай і чаканай дынамікі інфляцыі, а таксама ацэньваючы рызыкі з боку ўнутраных і знешніх умоў і рэакцыі на іх фінансавых рынкаў, адзначылі ў прэс-службе Нацбанка.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Соцыум

## Даведацца пра пенсію праз мабільны дадатак

### Як развіваецца персаніфікаваная сістэма ўліку?

**Даведацца, ці плаціць ваш работадаўца ўзносы ў фонд сацыяльнай абароны, што дае вам права на будучую пенсію, а таксама пра свой працоўны стаж хутка можна будзе праз мабільны дадатак. Ён з'явіцца ўжо ў гэтым месяцы і дазволіць атрымаць усе звесткі пра сваю працоўную біяграфію — перыяды работы, прафесію і займаную пасаду, у якога работадаўцы вы працавалі, а таксама па якіх падставах было звальненне.**

### ЯК КАНТРАЛЯВАЦЬ РАБОТАДАЎЦУ?

У дадатку — інфармацыя за апошнія 20 гадоў: з 1 студзеня 2003 года, калі, уласна кажучы, і пачала дзейнічаць персаніфікаваная сістэма ўліку.

— Дадатак дазволіць без электроннага лічбавага подпісу прайсці ідэнтыфікацыю праз банкаўскую сістэму, калі ў вас маецца мабільны банкінг. Акрамя сваёй працоўнай біяграфіі — перыядаў работы, прафесіі, пасады, у якога работадаўцы вы працавалі і на якіх падставах было звальненне, — можна атрымаць інфармацыю пра страхавыя ўзносы. Тут кожны грамадзянін можа не проста цікавіцца, а са свайго боку кантраляваць работадаўцу, ці налічваюцца ўзносы ў фонд сацыяльнай абароны ў поўным аб'ёме, — расказала **кіраўнік Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Юлія БЕРДНІКАВА**.


СТАР. 3

**Наталля КАЧАНАВА:**

# «НАШЫ САЦЫЯЛЬНЫЯ ПРАГРАМЫ ПРАЦУЮЦЬ ЭФЕКТЫЎНА»

**Магілёўшчына стала завяршальным рэгіёнам, у якім Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава правяла сустрэчу са старшынямі гар-, райвыканкамаў і гар-, райсаветаў. Удзел у нарадзе прынялі старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Ісачанка, памочнік Прэзідэнта — інспектар па Магілёўскай вобласці Леанід Мартынюк, старшыня Магілёўскага абласвета Ірына Раінчык. Мэта сустрэчы — падвесці вынікі за мінулы год і давесці да актыву рэгіёна тыя задачы, якія ставіць Прэзідэнт краіны. Перад дакладам спікер верхняй палаты беларускага парламента павіншавала прысутных з 85-гадовым юбілеем Магілёўскай вобласці. Яна пажадала працвітання рэгіёну, дабрабыту і здароўя яго жыхарам, плённай работы.**


Фота БелТА.

— Тыя задачы, якія былі пастаўлены перад кіраўніцтвам краіны па сацыяльна-эканамічным развіцці і давезены да кожнай вобласці, вядомыя. Яны вызначаны VI Усебеларускім народным сходам, Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, дзяржаўнымі праграмамі. І мы бачым, што, нягледзячы на санкцыйны ціск і іншыя праблемы, прадпрыемствы працуюць стабільна, зарплата выплачваецца, людзі працуюць, прадукцыя пастаўляецца на экспарт. Летась нашы аграрыі спрацавалі вельмі добра, забяспечылі прадукцыяй і сваю краіну, і паставілі на экспарт. Гэта сведчыць, што тая сістэма ўлады, тая структура, якая дзейнічае ў нашай краіне, эфектыўная. Мы пражылі мінулы год вельмі годна, нягледзячы на перыпетыі. Нашы сацыяльныя праграмы працуюць эфектыўна, летась тройчы павышалася пенсія, выплачваліся дапамогі на выхаванне дзяцей і іншыя. Працягваюць стабільна працаваць будаўнічая галіна, жыллёва-камунальная гаспадарка — наводзіцца парадак, праводзіцца добраўпарадкаванне гарадскіх, сельскіх тэрыторый — і іншыя. Мы правялі рэферэндум, дзе былі ўнесены дапаўненні ў Асноўны Закон нашай краіны, а зараз актыўна працуем над законапраектамі. Мы ўступілі ў палітычна важны перыяд для нашай краіны, у 2024 годзе ў адзіны дзень галасавання будзем выбіраць дэпутатаў усіх узроўняў, пачынаючы ад сельскіх Саветаў, заканчваючы Саветам Рэспублікі. Задача, якую ставіў перад намі Прэзідэнт, — не проста выжыць, а эфектыўна развівацца — выконваецца.

Старшыня Савета Рэспублікі заклікала прысутных выказаць прапановы наконт развіцця і ўдасканалення заканадаўства, калі такія маюцца ў раёнах. Трэба адзначыць, што Магілёўская вобласць ставіць перад сабой на гэты год амбіцыйныя планы. Пра іх на нядаўняй сустрэчы з актывам вобласці падрабязна паведаміў старшыня Магілёўскага аблвыканкама Анатоль Ісачанка. У сваім дакладзе ён вызначыў ключавыя кірункі далейшага ўстойлівага развіцця Прыдняпроўскага краю.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

Парламенцкі дзённік

# НА ФУНДАМЕНЦЕ СЯБРОЎСТВА І ЎЗАЕМНАЙ ПАДТРЫМКІ

## Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА абмеркаваў з паслом Кыргызстана ў Беларусі перспектывы супрацоўніцтва

**На пачатку сустрэчы Старшыня Палаты прадстаўнікоў нагадаў, што сёлета адзначаецца 30-годдзе з дня ўстанаўлення дыпламатычных адносін паміж Беларуссю і Кыргызстанам. Беларуска-кыргызскія адносіны, па словах Уладзіміра Андрэйчанкі, грунтуюцца на трывалым фундаменце сяброўства, узаемаразумення, падтрымкі.**

«Мы заўсёды адчувалі падтрымку з боку парламентарыяў Кыргызстана ў міжнародных арганізацыях, — дадаў спікер ніжняй палаты парламента. — Лічу, што ў нас даволі прадукцыйнае супрацоўніцтва ідзе і ў ЕАЭС, СНД, АДКБ. Добрая дагаворна-прававая база».

У апошнія гады адзначаецца і сур'ёзны рост узаемнага тавараабароту. «За 2021 год — каля $100 млн, за 2022 год — амаль у 1,5 раза прыбаўка, — удакладніў Уладзімір Андрэйчанка. — Гэта добрае дасягненне, але, тым не менш, патэнцыял у нас зусім іншы, і паказчыкі павінны быць значна вышэйшыя. Нам трэба актывізаваць работу па гэтых кірунках — у першую чаргу, што датычыцца гандлёва-эканамічных. Гэта ўсё ж аснова стабільнасці і ў Кыргызстане, і ў Беларусі. Трэба нам больш актыўна працаваць і ў сферы адукацыі, культуры, сувязяў паміж рэгіёнамі».

Сярод відаў супрацоўніцтва, якія існуюць паміж дзяржавамі, адным з найбольш асноўных і важных **Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кыргызстана ў Беларусі Эрмек ІБРАІМАЎ** назваў узаемадзеянне паміж парламентамі дзвюх краін. «Мы вядзём пастаянную работу па давядзенні да гатоўнасці пагаднення аб міжпарламенцкім супрацоўніцтве паміж нашымі краінамі, — удакладніў ён. — Агульнае разуменне і жаданне падпісаць гэты дакумент не проста ёсць, яно вялікае, бо ў нашай практыцы развіццё супрацоўніцтва паміж парламентамі з'яўляецца адным з асноўных, базавых відаў супрацоўніцтва».

Па словах пасла, Беларусі і Кыргызстану варта развіваць адносіны абсалютна ва ўсіх сферах. «Перш за ўсё ў гандлёва-эканамічнай сферы: нас радуе тая станоўчая тэндэнцыя, якая склалася апошнім часам адносна росту тавараабароту, — заўважыў пасол. — Беларуская прадукцыя добра вядомая


Фота БелТА.

ў Кыргызстане і карыстаецца добрай рэпутацыяй, знайшла сваю нішу. Кыргызская прадукцыя на працягу доўгага часу практычна не з'яўлялася на беларускім рынку. Гэтая тэндэнцыя цяпер мяняецца ў лепшы бок: з'яўляюцца некаторыя віды сельгаспрадукцыі на беларускім рынку, сёлета мы зафіксавалі з'яўленне кыргызскай тэкстыльнай прадукцыі».

У ходзе рабочай сустрэчы бакі абмеркавалі стан і перспектывы беларуска-кыргызскага міжпарламенцкага супрацоўніцтва, у тым ліку запланаваны на 2023 год афіцыйны візіт у Беларусь спікера парламента Кыргызстана Жагорку Кенеша. Асаблівая ўвага была ўдзелена пытанням узаемадзеяння ў гандлёва-эканамічнай і гуманітарнай сферах.

Уладзімір Андрэйчанка звярнуў увагу на тое, што візіт старшыні парламента Кыргызстана ў Рэспубліку Беларусь будзе знакавай падзеяй. «На сённяшні дзень мы стаім на правільным шляху ўмацавання і пашырэння нашага супрацоўніцтва, — рэзюмаваў ён. — Проста трэба прыкладаць да гэтага больш намаганняў. Прынамсі, беларускі бок у гэтым зацікаўлены».

**Паводле БелТА.**

Па сутнасці



# З цэлым народам гутарку весці

Агульная прастора проста звініць. Людзі пішуць, посцяць, лайкаюць, спрачаюцца — і ўсё гэта выносяць «на людзі». У кожнага сваё меркаванне, стаўленне, светаўспрыманне. І гэта добра! Праўда, толькі ў тым выпадку, калі да іншых ставяцца з павагай. Але галоўная прыкмета часу — людзі не чуюць іншых. Толькі свой гоман. А песня атрымліваецца, калі адзін чуе другога. Як у спевах, так і ў жыцці: трэба чуць іншых.

Пачуць чалавека ў афіцыйных установах, на прыёмах грамадзян. Захоўваць дыялог улады і грамадства. А пры такім дыялогу, асабліва калі ён добразычлівы, дэструктыўныя сілы ўздзеяння ўжо месца не будуць. Кіраўнік дзяржавы вядзе той дыялог з народам на працягу ўсяго свайго палітычнага жыцця. Такі мэйнстрым ён трансліруе і на нарадах у кабінетах Палаца Незалежнасці, і на свежым паветры беларускіх палеткаў. Такі прамы кантакт дапамагаў.

У Беларусі адбудавалі сістэму для звароту грамадзян. Прамыя лініі, асабістыя прыёмы. Напэўна, гэты дыялог спрацаваў не ўсюды. Абыякавасць і адпіскі былі. Таму людзі замест прыёму ў чыноўнікаў са сваімі абурэннямі пайшлі на вуліцу. У гэтым таксама ёсць прычына пратэстаў. А тыя, хто іх арганізоўваў, умела выкарысталі гэты момант у сваёй бруднай справе. Ніхто праблемы людзей вырашаць не збіраўся. Там вырашаліся геапалітычныя пытанні.

Прэзідэнт зноў патрабуе весці дыялог. Каманда кіраўніка дзяржавы — маніторыць градус грамадскага настрою. І калі сітуацыя патрабуе — умешваецца асабіста Першы. Дарэчы, пры вырашэнні такіх пытанняў прымаюцца і рашэнні дзяржаўнага маштабу. Напрыклад, як з той жа ініцыятывай па кантролі за цэнамі альбо па своечасовай выплаце зарплат.

Але, вядома, Прэзідэнт усё не ўбачыць. Добра, што ёсць паплечнікі. Увогуле, паступова змяняецца агульнае аблічча вертыкалі. Сучасныя губернатары, шмат кіраўнікоў новай фармацыі і ў гар-, і райвыканкамах. Я як журналіст аб гэтым ведаю.

Па праўдзе кажучы, розныя бываюць і дэпутаты, і чыноўнікі. Не ад мандата і крэсла залежыць. Ад чалавека, што выхавалі мы самі, — наша грамадства. Таму людзям трэба зразумець: прадстаўнікі ўлады — не чараўнікі. Не на ўсё хапае сродкаў. Аднак тыя, хто з'яўляецца прадстаўніком улады, павінны памятаць: няважна, хто да вас звярнуўся — старэнькая бабуля, прафесійны скаржнік ці грамадскі актывіст, — перад вамі перш за ўсё — беларус. Суайчыннік. І краіна ў нас такая, якія мы самі. І вось у кожным такім кабінеце таксама «тут і цяпер» вырашаецца лёс краіны і яе будучыня. Для нас і нашых дзяцей, бо калі мы не будзем вырашаць свае пытанні, то за нас вырашаць іх іншыя.

Цяпер аб станоўчым прыкладзе. Памятаеце, у якіх складаных умовах беларусы адфарматавалі канстытуцыйныя перамены. Палітызаванае грамадства падчас такіх электаральных кампаній — падняссі трыгер — успыхне. А мы годна выйшлі з усяго гэтага выпрабавання. Усё адбылося ў рэжыме праўды. Адны пачулі, другія выгаварыліся. Дамаўляцца лепш за ўсё ў дыялогавых лакацыях. А мы, беларусы, гэта ўмеем. І ўсё пачынаецца з простага — з работы са зваротамі грамадзян. Гэта няхай іншыя там у судах вырашаюць муніцыпальныя спрэчкі. А мы павінны аўтэнтычна — па-беларуску. Каб чулі адзін аднаго, а не стрэлы гармат.

Галоўнае адлюстраванне палітыкі Лукашэнкі, ініцыяванага ім дыялогу з людзьмі з'яўляецца яскравая фатаграфія. Адна з самых любімых, Прэзідэнт ганарыцца ёй. Палессе, на лузе — кіраўнік дзяржавы, вакол — людзі працы. Так было, так ёсць і так будзе. Размова наладжана. Памятаеце, як у Паэта: «З цэлым народам гутарку весці, сэрца мільёнаў падслухаць біцця».

**Яўген ПУСТАВОЙ.**

# Даведацца пра пенсію праз мабільны дадатак

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

На падставе тых звестак, якія назапашаны за 20 гадоў, можна будзе разлічыць і свой страхавы стаж — колькі гадоў, месяцаў і дзён будзе ўлічана для будучай працоўнай пенсіі. Нагадаем, што для яе атрымання ёсць мінімальны парог. Сёлета ён складае 19 гадоў страхавога стажу. І кожны год павялічваецца на паўгода, пакуль не дасягне 20 гадоў у 2025-м.

Атрымаць пералічаныя звесткі з сістэмы персаніфікаванага ўліку можна яшчэ двума спосабамі. Традыцыйны шлях — звярнуцца ў тэрытарыяльны орган фонду сацыяльнай абароны насельніцтва. Спатрэбіцца дакумент, які сведчыць асобу, і заява. Вам выдадуць выпіску з індывідуальнага рабочага рахунку з інфармацыяй, у якога наймальніка вы працавалі, перыяды ўплаты ўзносаў у бюджэт фонду і пашыраную інфармацыю, ідэнтычную той, што маецца ў працоўнай кніжцы. Летась такім спосабам скарысталася 35 тысяч чалавек.

Больш сучасны спосаб — атрымаць звесткі на адзіным партале электронных паслуг. Такая магчымасць з'явілася ў 2016-м і з кожным годам набірае папулярнасць. Але ёй можна скарыстацца пры наяўнасці электроннага лічбавага подпісу. Летась органамі фонду сацыяльнай абароны аказана больш за пяць мільёнаў электронных паслуг. Часта людзі не самі іх выкарыстоўваюць, а звяртаюцца ў банкаўскую ўстанову для атрымання мікракрэдытаў. Тая, у сваю чаргу, са згоды грамадзяніна атрымлівае даныя ў фондзе.

## 4,5 МІЛЬЁНА БЕЛАРУСАЎ ПРАЦУЮЦЬ, 2,4 МІЛЬЁНА АТРЫМЛІВАЮЦЬ ПЕНСІІ

Сістэме персаніфікаванага ўліку 1 студзеня споўнілася 20 гадоў. Яе вядзеннем займаецца фонд сацыяльнай абароны. Такім чынам у 2003 годзе на кожнага працуючага грамадзяніна ў органы фонду паступілі даныя аб адкрыцці індывідуальных асабовых рахункаў. Тады аднамомантна іх было адкрыта 4,5 мільёна.

Цяпер у сістэме персаніфікаванага ўліку маецца больш чым 8,3 мільёна індывідуальных асабовых рахункаў. З іх летась індывідуальнымі звесткамі папаўняліся 4,5 мільёна — менавіта столькі грамадзян ажыццяўлялі працоўную дзейнасць летась. Астатнія асабовыя рахункі адкрыты на грамадзян, якія ўжо дасягнулі адпаведнага ўзросту, атрымліваюць пенсіі і не ажыццяўляюць працоўную дзейнасць. Атрымальнікаў — каля 2,4 мільёна.

Аднак нават у выпадку смерці асабовы рахунак не закрываецца, бо інфармацыя з яго можа спатрэбіцца пры прызначэнні пенсіі па страце кармільца. І тут істотным з'яўляецца той факт, што кармілец быў застрахаваны.

## ЯКАЯ ІНФАРМАЦЫЯ ЁСЦЬ НА АСАБОВЫМ РАХУНКУ?

На кожнага пры ўладкаванні на першае рабочае месца адкрываецца індывідуальны асабовы рахунак, які суправаджае яго ўсю працоўную дзейнасць. Звесткі, якія на яго заносяцца, у будучыні, пры афармленні пенсіі, дазволяць без папер пацвердзіць правы на яе. Акрамя перыядаў работы, даты прыёму і звальнення, адлюстроўваюцца перыяды працы і памеры штомесячнага заробку, на які налічваліся і плаціліся абавязковыя ўзносы. Сёння гэта 29 %, з іх 1 % утрымліваецца з заработнай платы, а 28 % уплачвае работадаўца.

Паколькі гэтыя звесткі акумулююцца ў электронным выглядзе толькі з 2003 года, то пакуль што пры афармленні пенсіі дзейнічае гібрыдная сістэма. Калі рабочая дзейнасць ажыццяўлялася да 1 студзеня 2003 года, яе перыяды трэба пацвердзіць працоўнай кніжкай і папяровымі даведкамі аб памеры заробку. Калі да часу дасягнення пенсіённага ўзросту арганізацыя, у якой вы працавалі да 2003 года, ліквідавана, на ўстаноўленым парадку звесткі запрошваюцца ў архіўных установах. З 2003 года звесткі пацвярджаюцца выпіскай з індывідуальнага асабовага рахунка, гэта адбываецца без удзелу грамадзяніна.

Сёння даныя, якія ўлічваюцца ў асабовых рахунках, накіраваны не толькі на тое, каб захаваць пенсіённыя правы. Яны з'яўляюцца пацверджаннем і сацыяльных гарантый, што прадстаўлены цэлым комплексам дапамог. На сацыяльнае страхаванне ўплачваецца 6 % заробку. З іх акумулююцца сродкі, якія з'яўляюцца крыніцай выплат дапамог па часовай непрацаздольнасці (бальнічных), сямейных дапамог, у прыватнасці, аднаразовай у сувязі з нараджэннем дзіцяці, па доглядзе малога да трох гадоў. Усе звесткі таксама паступаюць на асабовы рахунак і ўлічваюцца.

Сведчаннем таго, што ваш індывідуальны асабовы рахунак існуе, з'яўляецца наяўнасць у вас пасведчання дзяржаўнага пенсіённага страхавання — зялёнай пластыкавай карткі. І пры выкананні работы па працоўным ці грамадзянска-прававаым дагаворы ці прадпрымальніцкай дзейнасці на ваш асабовы рахунак адразу паступаюць і захоўваюцца звесткі, неабходныя як для прызначэння пенсіі, так і выплаты дапамог.

## ЯК ЗМЕНІЦЦА ПАРАДАК НАЛІЧЭННЯ БАЛЬНІЧНЫХ?

Сістэма персаніфікаванага ўліку паступова ўдасканальваецца. У прыватнасці, з 1 ліпеня 2019 года даныя, якія характарызуюць працоўную дзейнасць, істотна пашырыліся. Акрамя даты прыёму і звальнення, паступае інфармацыя, якая адлюстроўвае назву прафесіі і пасады, па якой працуе грамадзянін, форму рабочых адносін, інфармацыю аб прысвоеным класе, разрадзе, кваліфікацыйнай катэгорыі, падставы, па якіх грамадзянін звольнены. Гэта дазваляе максімальна наблізіць інфармацыю на індывідуальным рахунку да той, што маецца ў працоўнай кніжцы.

З 1 красавіка 2022 года былі зменены тэрміны падавання інфармацыі аб руху працоўных рэсурсаў. І сёння фонд сацыяльнай абароны валодае ёй у рэжыме рэальнага часу. Калі грамадзянін прымаецца на работу, то работадаўца не пазней за 5 каляндарных дзён дае інфармацыю аб гэтым. Пры звальненні звесткі паступаюць не пазней за дзень.

З 1 студзеня 2024 года зменіцца парадак налічэння бальнічных і дапамог пры цяжарнасці і родах. Даныя персаніфікаванага ўліку стануць асноўнымі пры іх разліку.

— Сутнасць наваўвядзенняў у тым, што цяпер дзяржава бярэ на сябе адказнасць за правільнасць разліку двух параметраў, — тлумачыць Юлія Берднікава. — Першы (ён існаваў і раней) — вызначэнне памеру сярэднядзённага заробку, з якога будзе налічвацца дапамога. Калі раней яго самастойна разлічвала бухгалтарская служба, то з 2024 года ён будзе разлічвацца па тых даных, якія ўлічаны ў індывідуальным асабовым рахунку грамадзяніна. Другі параметр — працягласць удзелу грамадзяніна ў сістэме дзяржаўнага сацыяльнага страхавання (за які час уплачваліся ўзносы ў сістэму дзяржаўнага сацыяльнага страхавання). Мы іх разлічым і выдадзім бухгалтарскай службе для разліку дапамогі.

Другі параметр — новы, ён з'явіўся ў сувязі са змяненнем палажэння аб парадку прызначэння працоўных дапамог па часовай непрацаздольнасці, цяжарнасці і родах. Калі працягласць уплаты ўзносаў складзе 10 гадоў і больш, то з першага дня захворвання грамадзяніну ў памеры 100 % будзе кампенсаваны страчаны заробак. Калі працягласць да 10 гадоў, то памер дапамогі будзе налічаны ў памеры 80 % страчанага заробку. Сёння дапамога не залежыць ад працягласці ўплаты ўзносаў у бюджэт фонду і разлічваецца наступным чынам: 80 % з 1 да 12-га дня хваробы і з 13-га дня — 100 % страчанага заробку.

Змяняецца і разліковы перыяд, на падставе якога вылічваецца дзённы заробак, у яго будзе ўваходзіць 18 апошніх месяцаў, нават калі за гэты час было некалькі месцаў работы. Прычым з улікам больш працяглага перыяду сам заробак будзе павялічвацца, бо будуць улічвацца ўсе выплаты, на якія налічваюцца абавязковыя страхавыя ўзносы.

**Алена КРАВЕЦ.**

Блізкая ўлада

# ЖЫЛЛЁВЫЯ ПРАБЛЕМЫ — У «ЛІДАРАХ»

**Іван КРУПКО правёў прамую тэлефонную лінію і прыём грамадзян у Брагіне**

**Па дапамогу ў вырашэнні складаных сітуацый з жыллём да старшыні Гомельскага аблвыканкама звярнуліся адразу некалькі жыхароў вобласці.**

Сваю жыллёвую праблему на прыёме кіраўніку рэгіёна агучыла ўрач з Мазыра. Заяўніца расказала, што пасля заканчэння вучобы яна была размеркавана на працу ў Мазырскі раён. Як маладзі спецыяліст атрымала арэнднае жыллё. Пасля адпрацоўкі перайшла на працу ў Мазыр урачом станцыі пералівання крыві, дзе працуе і цяпер. Увесь гэты час медык працягвала пражываць у арэндным жыллі, якое атрымала яшчэ ў 2017 годзе.

Як патлумачыла жанчына, новы дагавор на кватэру яна заключыла ў ліпені мінулага года. Але ўжо ў снежні ўзніклі праблемы з жыллём. Спачатку выяўлены парушэнні ў дакументах, папрасілі згоду на пражыванне на агульных умовах і пераразлік за тры апошнія месяцы. Напярэдадні новага года раённае ЖКГ абавязала жанчыну наогул выселіцца з жылля і аплаціць запазычанасць за кватэру ў памеры больш за дзве тысячы рублёў, бо спецыяліст не мела права на льготу па аплаце арэнды.



Фота БелТА.

— Пытанне ўрэгуляваць у максімальна кароткія тэрміны, — даў даручэнне пасля звароту мазыранкі Іван Крупко.

Да кіраўніка рэгіёна таксама з жыллёвай праблемай звярнулася і яшчэ адна жыхарка Мазырскага раёна.

— Дом дастаўся нам ад бабулі, але ў спадчыну не ўступілі. Мой муж памёр. Я ў дэкрэтным адпачынку, свайго жылля няма. Цяпер жыву ў свекрыві, — апісала сваю складаную жыццёвую сітуацыю маладая маці, дом якой згарэў некалькі месяцаў таму.

Губернатар пераканаў, што гэтай сям'і абавязкова дапамогуць.

Між тым яшчэ дзве шматдзетныя маці ўжо з Брагінскага раёна таксама вырашылі шукаць дапамогі ў кіраўніка рэгіёна. Жыхаркі аграгарадка Малейкі паскардзіліся губернатару на парушэнне падрадчыкам дагаварных абавязацельстваў па ўзвядзенні жылля для іх сем'яў. Па словах заяўніц, пры заключэнні дагавора іх запэўнівалі, што сродкаў, якія выдзелены на будаўніцтва як шматдзетным сем'ям, хопіць на ўзвядзенне і касметычны рамонт жылля. Работы яшчэ не скончаны, а грошы на будаўніцтва практычна зрасходаваны.

Як растлумачылі спецыялісты раёна, першапачаткова заяўнікамі былі падпісалі дагаворы на ўзвядзенне жылля на суму больш за 300 тысяч рублёў кожны. Дагаворам было прадугледжана аздабленне дарагімі матэрыяламі, усталяванне «цёплай падлогі», і забудоўшчыкі самі не адмовіліся ад прапанаваных высокіх па кошце будаўнічых работ.

— Разабрацца ў кошце кожнага матэрыялу, кожнага віду работ. Пакуль дамы не будуць узведзены, пытанне трымаць на кантролі, — даручыў старшыня аблвыканкама адказным службам.

Жыхар Светлагорска звярнуўся з просьбай аказаць дапамогу ў добраўпарадкаванні мемарыяльнага комплексу ў памяць аб ахвярах нацызму на сваёй малой Радзіме — у Брагіне. Па яго словах, неабходна заасфальтаваць пляцоўку каля мемарыяла.

Іван Крупко пераканаў, што добраўпарадкаванне абавязкова будзе праведзена.

Падчас прыёму кіраўніка рэгіёна таксама прагучала пытанне афармлення спадчыны на дом у Гомельскім раёне. Быў таксама зварот аб вырашэнні праблемы з падтапленнем вуліцы ў новым мікрараёне Брагіна. Па кожным звароце, прынятым падчас «прамой лініі» і прыёму грамадзян, Іван Крупко даў канкрэтныя даручэнні адказным спецыялістам.

**Наталля КАПРЫЛЕНКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## З пачатку года ў ЗША адбываюцца ў сярэднім па два выпадкі масавай стральбы за дзень



Напярэдадні шэсць чалавек, уключаючы шасцімесячнае дзіця, загінулі ў выніку стральбы ў Каліфорніі, якая стала трыццатым такім выпадкам у ЗША з пачатку года. Аб гэтым паведаміў партал Gun Violence Archive, які займаецца зборам статыстыкі эпізодаў з ужываннем агнястрэльнай зброі. Барацьба з «эпідэміяй узброенага гвалту», як характарызуе тое, што адбываецца, прэзідэнт ЗША Джо Байдэн, з'яўляецца дэклараваным прыярытэтам адміністрацыі, аднак значных зрухаў у гэтым працэсе, нягледзячы на намаганні, не адбываецца. У студзені мінулага года Белы дом аб'явіў, што ліцэнзію на зброю дадуць толькі тым, у каго ёсць месца для яе захоўвання. Пры гэтым на папярэднім тыдні шасцігадовае дзіця ў штаце Віргінія страляла ў настаўніцу з пісталета сваёй маці. Статыстыка валодання зброяй за 2021 год дэманстравала, што ў ЗША на 100 чалавек яе даводзіцца 120,5 адзінкі. Байдэн казаў, што захоўвае дома чатыры драбавікі.

## У Шатландыі настаўнікі праводзяць 16-дзённую праграму забастовак

Настаўнікі ў Шатландыі распачалі серыю з 16 акцый пратэстаў. Яны патрабуюць павышэння заработнай платы на фоне рэкорднага росту кошту жыцця, паведаміў тэлеканал Sky News. Забастоўкі будуць праводзіцца толькі ў рабочыя дні з панядзелка па пятніцу, таму 16 акцый пратэстаў зацягнуцца больш чым на тры тыдні і завершацца 6 лютага. У кожны з дзён на пікеты будуць выходзіць настаўнікі ў двух розных муніцыпалітэтах. У выніку педагогі ва ўсіх 32 шатландскіх акругах наладзяць забастоўкі. Раней яны не пагадзіліся з паўторнай прапановай улад аб павышэнні заробку на пяць працэнтаў і патрабуюць павелічэння выплат на дзесяць працэнтаў. Як вядома, у Вялікабрытаніі назіраецца хваля забастовак на фоне рэкорднай інфляцыі. На пратэсты выходзяць супрацоўнікі чыгуначных кампаній, адвакаты, работнікі аэрапортаў, паштальёны і і іншыя.

## Інфляцыя ў Германіі дасягнула рэкорднага ўзроўню

Летась інфляцыя склала 7,9 працэнта. Пра гэта паведаміла нямецкая медыягрупа Redaktionsnetzwerk Deutschland (RND) са спасылкай на даныя Федэральнага статыстычнага ўпраўлення краіны. Адзначаецца, што тэмпы інфляцыі ў ФРГ захоўваліся высокімі на працягу ўсяго мінулага года. Па словах прэзідэнта Федэральнага статыстычнага ўпраўлення Германіі Рут Бранд, гістарычна высокі гадавы ўзровень быў у першую чаргу абумоўлены рэзкім скачком цэн на энерганосьбіты і прадукты харчавання. Як удакладняе Business Insider, энерганосьбіты падаражэлі летась на 34,7 працэнта. Рост тарыфаў на электрычнасць склаў у сярэднім 20,1 працэнта, паліва — 26,8 працэнта, а прадукты харчавання — на 13 працэнтаў. Паводле прагнозаў эканамістаў, чакаць істотнага зніжэння спажывецкіх цэн сёлета не выпадае.

# ГІБЛАЕ МЕСЦА

## Чаму вымірае Прыбалтыка?



**ЦЯГАМ дзесяцігоддзяў Прыбалтыка трымае сумнае лідарства па катастрафічным скарачэнні насельніцтва. Латышскія, літоўскія і эстонскія гарады запаўняюць старыя і дзеці, у той час як маладыя і працаздольныя купляюць «білет у адзін канец» — у краіны, поўныя магчымасцяў і жыццёва важных умоў, адзначыў Baltnews. Прыбалтыйскія дзяржавы ўваходзяць у топ-20 краін з самым хуткім змяншэннем насельніцтва, сведчаць даныя World Population Review. Літва займае другое месца. Згодна з прагнозамі, да 2050 года колькасць жыхароў рэспублікі скароціцца на 22,1 працэнта. Следам ідзе Латвія, яе паказчык роўны 21,6 працэнта. Эстонія праз 27 гадоў страціць 12,7 працэнта жыхароў. Да 2050-га агульная колькасць насельніцтва прыбалтыйскіх краін не будзе дацягваць і да 5 мільёнаў чалавек. Мяркуецца, што ў Латвіі будзе пражываць 1,5 мільёна чалавек, а ў Літве і Эстоніі — адпаведна 2,1 млн і 1,2 млн. Чаму ж вымірае Прыбалтыка?**

### ДЭПРЭСІЙНЫЯ ПРАЦЭСЫ

Прайшло больш чым 15 гадоў з таго часу, як Літва, Латвія і Эстонія ўступілі ў Шэнгенскую зону, што прывяло да рэкорднай дэпапуляцыі ў гэтых краінах з-за масавай эміграцыі маладых працаздольных грамадзян, нагадаў rubaltic.ru. Свабода перамяшчэння, якая з'явілася, паказала, што рэспублікі Прыбалтыкі не самыя прывабныя для жыцця і не канкурэнтаздольныя на рынку працы ў вачах уласнай моладзі. Як вынік — нізкая нараджальнасць, высокая смяротнасць і адток насельніцтва паставілі колішніх «балтыйскіх тыграў» на вяршыню глабальнага антырэйтынгу нацый, схільных да рызыкі вымірання.

Як вядома, пагадненне, заключанае ў люксембургскай вёсцы Шэнген у 1985-м, прадугледжвае свабоднае перамяшчэнне людзей з грамадзянствам краін, якія яго падпісалі. У 2007 годзе да яго далучыліся яшчэ дзевяць дзяржаў, у тым ліку Літва, Латвія і Эстонія, якія ў 2004-м сталі членамі Еўрасаюза.

Прайшло ўжо дастаткова часу, каб зрабіць пэўныя высновы аб тым, як гэта адбілася на дэмаграфіі краін Прыбалтыкі, улады якіх лічаць сябе «сапраўднымі» еўрапейцамі, а выкарыстанне «шэнгена» — прывілеяй. Уступленне ў Шэнгенскую зону 15 гадоў таму стала адной з прычын рэкорднай дэпапуляцыі Літвы, Латвіі і Эстоніі з-за масавай эміграцыі маладога працаздольнага насельніцтва, лічыць rubaltic.ru.

Як адзначаў галоўны рэдактар rubaltic.ru, палітолаг Аляксандр Насовіч у кнізе «Гісторыя заняпаду. Чаму ў Прыбалтыкі не атрымалася», апублікаванай яшчэ ў 2015-м, «за апошнія 25 гадоў Прыбалтыка страціла прыкладна два мільёны жыхароў. Насельніцтва рэгіёна скарацілася амаль на чвэрць! Гэта беспрэцэдэнтны паказчык для сучаснай Еўропы: у адным з рэгіёнаў ЕС адбываецца сапраўдная дэмаграфічная катастрофа».

Падобнага меркавання прытрымліваецца і эксперт фонду ААН у галіне народанасельніцтва Мікалай Боцеў. Ён заўважыў, што працэсы дэпапуляцыі ва Усходняй Еўропе, якія назіраюцца, не маюць аналагаў у сусветнай гісторыі. Многія краіны схільныя і да натуральнага змяншэння насельніцтва, і да масавай эміграцыі. Уздзеянне двух гэтых фактараў адначасова не сустракалася яшчэ ні разу, пакуль відавочна не акрэслілася тут у 1990-х гадах.

Прычым, на думку эксперта ААН, за граніцу, як правіла, з'язджаюць менавіта спецыялісты з вышэйшай адукацыяй, якія калі і вяртаюцца назад, то ўжо хіба толькі пенсіянерамі. Недахоп працоўных рэсурсаў у Заходняй Еўропе не з'яўляецца сакрэтам і даўно вывучаецца сацыёлагамі і дэмографамі. Дэпрэсійныя працэсы, распачатыя ў краінах былога сацлагера пасля яго распаду, прывялі да таго, што мясцовае працаздольнае насельніцтва масава паехала ў «старую» Еўропу, закрыўшы там на час праблему недахопу таннай рабочай сілы.

### ШЭНГЕНСКАЯ ПАСТКА

Паводле даных Дэпартамента статыстыкі Літвы, з пачатку студзеня па канец жніўня 2021 года з краіны з'ехалі 11 133 грамадзяніны, а за аналагічны перыяд летась — 18 345. У справаздачы Countrymeters, якая спасылаецца на Дэпартамент па эканамічных і сацыяльных пытаннях ААН, на працягу многіх гадоў самым папулярным напрамкам эміграцыі была Вялікабрытанія — да яе выхаду з Еўрасаюза 38 працэнтаў літоўцаў з'язджалі менавіта туды.

Усю катастрафічнасць сітуацыі дэманструюць наступныя лічбы: насельніцтва Літвы з 1990-х скарацілася з 3,6 млн чалавек да менш чым 2,8 млн, Латвіі — з 2,6 млн да 1,8 млн, Эстоніі — з 1,5 млн да 1,3 млн. Аднак многія эксперты падазраюць, што нават гэтыя паказчыкі нацягнуты, а рэчаіснасць яшчэ горшая. Пры гэтым, як адзначыў загадчык кафедры міжнародных адносін і дыпламатыі МДУ, доктар гістарычных навук Мікалай Платошкін, «у савецкі перыяд у Літве, напрыклад, адзначаўся пік нараджальнасці, працягласці жыцця і росту колькасці насельніцтва. У 1959 годзе ў Літоўскай ССР жылі 2,7 млн чалавек, у 1970-м — 3,1 млн, а ў 1989-м — 3,7 млн чалавек».

На думку мігрыруючых прыбалтыйскіх грамадзян, Літва, Латвія і Эстонія — не самыя прывабныя месцы Еўрасаюза, таму дзеці ўжо ў школе ведаюць, што будуць працаваць у іншай краіне. Як вядома, у таго ж прэзідэнта Латвіі Эгілса Левітса родныя жывуць у Германіі і Вялікабрытаніі. Але чым прываблівае Заходняя Еўропа і як там прымаюць прыбалтыйскіх мігрантаў? «Вельмі запатрабаваныя людзі з вышэйшай адукацыяй, асабліва патрэбныя людзі з тэхнічнай адукацыяй. Тыя, у каго прагрэсу ў гэтым няма, могуць працаваць кім заўгодна: бармэнамі, мыйшчыкамі машын або на запраўцы ў Нарвегіі і атрымліваць зарплату ў шэсць разоў больш, чым атрымлівае ў Літве дэпутат Сейма. Пры любым варыянце зарплаты там будуць вышэйшыя, магчымасцяў пабудаваць кар'еру больш і жыць там лепш. Таксама ёсць усё для вольнага часу і выхавання дзяцей», — упэўнены Аляксандр Насовіч.

Вынікі апытання, праведзенага сацыялагічным агенцтвам SKDS у 2020 годзе, паказалі, што трэць



насельніцтва Латвіі з'ехала б жыць за мяжу, з'явіся ў іх такая магчымасць. Як адзначыў кіраўнік SKDS Арніс Какціньш, «пандэмія фактычна ніяк не паўплывала на настроі жыхароў — у апошнія гады доля людзей, якія выказалі жаданне з'ехаць, застаецца нязменнай». У кастрычніку 2020 года вядучы даследчык Інстытута філасофіі і сацыялогіі Латвійскага ўніверсітэта Марціньш Капранс распавёў, што пакінуць краіну хочуць каля чвэрці мясцовай моладзі. Паводле яго слоў, ЗША, Германія і Іспанія — тры самыя папулярныя краіны, куды хацелі б пераехаць маладыя прыбалты.

Як паказала практыка, «еўрапейскі выбар» краін Прыбалтыкі для іх насельніцтва зводзіцца выключна да магчымасці свабодна з'ехаць за граніцу. За гады знаходжання ў заходніх інтэграцыйных структурах Літва, Латвія і Эстонія страцілі практычна ўвесь свой значны эканамічны патэнцыял, які ў іх быў. Што ж цяпер мае Прыбалтыка праз амаль 19 гадоў пасля ўступлення ў ЕС і НАТА? Атрымліваецца, толькі адкрытыя межы і датацыі для ўлады. «[Гэта значыць] свабоду перамяшчэння па Еўрасаюзе і магчымасць спакойна з'ехаць са сваіх краін, працаваць і жыць дзе-небудзь у Парыжы ці Мілане, а не на задворках Еўропы. Плюс да ўсяго, для бюракратыі і для ўлады гэта, вядома ж, выгада — датацыі ЕС, якія ідуць праз рукі ўрада. Частка асядае ў іх кішэнях, размяркоўваецца паміж фірмамі і падрадчыкамі з агульнымі інтарэсамі», — распавёў Аляксандр Насовіч. А вось упушчанага за 18 гадоў членства ў Еўрасаюзе налічылася вельмі шмат. «Была праігнараваная каштоўная магчымасць — стаць мостам паміж Захадам і Усходам», — адзначыў эксперт.

Шэнгенскія дамовы сталі пасткай для Прыбалтыкі, што прывяло да значнага зыходу мясцовага насельніцтва ў пошуках лепшага жыцця пасля спусташэння іх краін заходнім капіталам і мясцовымі ўладамі, адзначыў rubaltic.ru. А ва ўмовах разбурэння Злучанымі Штатамі еўрапейскай эканомікі і высмоктвання з яе апошніх сокаў ЕС можа ператварыцца ў татальную зону бедства, у межах якой праславутая заходняя салідарнасць і іншыя міфы разбурацца канчаткова.

### МЯДЗВЕДЖЫ «КУТ»

Летась у першым паўгоддзі ў Латвіі, Літве і Эстоніі зафіксавана істотнае зніжэнне нараджальнасці. Пра гэта паведаміла выданне Neatkariga. Удакладняецца, што, паводле звестак статыстычных упраўленняў, за гэты час нараджальнасць у Латвіі знізілася на 5,8 працэнта, у Эстоніі — на 9,5 працэнта і ў Літве — на 10,8 працэнта. Таксама адзначаецца, што ў чэрвені прошлага года ў Латвіі нарадзіліся 1452 дзіцяці, што з'яўляецца самай нізкай колькасцю за ўвесь час яе дзяржаўнага існавання. Да гэтага мінімальны паказчык быў зафіксаваны ў чэрвені 1998 года, калі нарадзіліся 1552 дзіцяці.

Надалей паказчыкі працягвалі пагаршацца. У лістападзе мінулага года ў Латвіі з'явіліся на свет усяго 1053 дзіцяці. Пра гэта паведамляецца на сайце Цэнтральнага статыстычнага ўпраўлення краіны. Летась за 11 месяцаў у прыбалтыйскай рэспубліцы было зарэгістравана 14,4 тысячы немаўлят. За гэты час у Латвіі памерла амаль удвая больш, чым нарадзілася, — 27,3 тысячы чалавек. У Эстоніі статыстыка таксама неспрыяльная. Паводле даных МУС, летась у краіне з'явіліся на свет 11,5 тысячы дзяцей — найніжэйшы



паказчык у бягучым стагоддзі. Летась у краіне было зарэгістравана 17,2 тысячы смерцяў. Тым часам Літва трапіла ў дэмаграфічную яму, якой не было 20 гадоў. Па словах дэмографаў, нараджальнасць у краіне стала ніжэйшай за самыя змрочныя прагнозы. Як адзначыла прафесар кафедры сацыялогіі ўніверсітэта імя Вітаўта Вялікага Аўшра Маслаўскайтэ, «гэта ў Літве назіраецца амаль 30 гадоў. У нас усе дэмаграфічныя працэсы адмоўныя. У нас непажаданыя паказчыкі смяротнасці, была высокая эміграцыя, нізкая нараджальнасць».

Чаму скарачэнне насельніцтва Прыбалтыкі ператварылася ва ўстойлівую тэндэнцыю, а ўлады пускаюць усё на самацёк? «Першая прычына рэзкага скарачэння народанасельніцтва ў тым, што Прыбалтыка пасля распаду Савецкага Саюза стала перыферыяй перыферый заходняга свету. Гэта далёкая ўскраіна, на якой моладзі няма чаго лавіць і няма за што жыць. Усе больш-менш амбіцыйныя, мэтанакіраваныя, энергічныя і маладыя людзі з'ехалі ў Скандынавію і Заходнюю Еўропу», — растлумачыў у гутарцы з Baltnews Аляксандр Насовіч.

Другая прычына — у нежаданні ўладаў займацца сацыяльнымі і эканамічнымі пытаннямі. Пры гэтым прыбалтыйскія палітыкі працягваюць уводзіць грамадзян у зман і пераконваць, што «ўсё змянілася» ці вось-вось зменіцца. «Кіраўнікам гэтых рэспублік няма ніякай справы да насельніцтва. Тут не проста прайдзісветы, а прэзідэнты і кіраўнікі ўрадаў, прызнаных на міжнароднай арэне краін — членаў ААН, — адзначыў Аляксандр Насовіч. — Насельніцтва на гэтай тэрыторыі можа ўвогуле не быць. Для іх задач гэта ўсё роўна. Нават самы маленькі працэнт будзе забяспечваць іх жыццядзейнасць і задавальняць базавыя патрэбы. А ўсе астатнія жыхары могуць спакойна з'язджаць, як яны тое рабілі на працягу дзесяцігоддзяў. Для ўлады гэта нават выгадна, паколькі такім спосабам здымаецца сацыяльна-палітычнае напружанне. Сацыяльнай палітыкай і эканомікай можна не займацца ў прынцыпе. Тыя, хто не задаволены, проста бяруць і з'язджаюць».

Але ці ёсць у прыбалтыйскіх уладаў магчымасць пазбегнуць адтоку насельніцтва? І пры якіх умовах магчымае вяртанне грамадзян? «Пазбегнуць адтоку насельніцтва немагчыма, — упэўнены Аляксандр Насовіч. — Дадзенае пытанне было закрыта яшчэ гадоў дзесяць таму. Тады ўлада прымала нейкія нясмелыя і непераканаўчыя спробы запусціць праграму рээміграцыі насельніцтва, але яны праваліліся за адсутнасцю сэнсу людзям вяртацца ў гэтыя краіны. Цяпер пра тое гаворкі не вядзецца».

Масавы ад'езд насельніцтва з прыбалтыйскіх краін у Заходнюю Еўропу, дэіндустрыялізацыя і абязлюджванне прывялі да нечаканага эфекту. Прасторы, дзе раней сяліліся людзі, цяпер актыўна займаюць звяры, у тым ліку драпежнікі — мядзведзі, ваўкі і нават нябачаныя раней у гэтых мясцінах шакалы. Толькі ў адной Эстоніі за 2020 год было зафіксавана каля 250 мядзведжых «атак», сярод якіх аказалася разбурэнне не толькі пчальнікоў, але і іншых гаспадарчых пабудоў. Увесну 2020-га мядзведзяў заўважылі нават на вуліцах аднаго з раёнаў Таліна — Хааберсці. Прыйшлося пачынаць паліцэйскую аперацыю па выцясненні драпежнікаў з горада, да якой прыцягнулі таксама паляўнічых. Заолагі нагадваюць, што мядзведзь не любіць мітусні і вялікіх людскіх скапленняў, прывязаны да мясцін, дзе дастаткова ежы. Аднак калі гадоў пятнаццаць таму, напрыклад, у Латвіі налічваліся 7724 населеныя пункты, то дзесяць гадоў таму — ужо 7006, а цяпер — каля 6300. Многія вёскі стаць бязлюдныя...

**Пётр ДУНЬКО.**

# РАНІЦА ПАЧЫНАЕЦЦА З... АБДЫМКАЎ



*Святлана Міхайлаўна працуе настаўніцай пачатковых класаў. Пра такіх, як яна, кажуць «педагог ад Бога». Штораз, калі расказвае пра сваіх дзяцей, адчуваецца, як яна іх любіць, шкадуе. Прынамсі, у мяне з галавы не выходзіць гісторыя пра двух брацікаў. Іх бацькі разышліся і стварылі новыя сем'і. Хлопчыкі засталіся жыць з татам і яго новай жонкай — цёцяй Верай. З мамай бачацца толькі па выхадных. «Неяк на ўроку старэйшы з іх сядзіць і плача, — распавядае Святлана Міхайлаўна. — «Ягор, чаму ты плачаш?» — пытаюся. «А ён па маме сумуе», — падказаў хтосьці з дзяцей. «Ну, ідзі сюды», — кажу. Пасадзіла я свайго трэцякласніка на калена, пагладзіла па галаве: «Ведаеш, Ягорка, тыдзень вельмі хутка заканчваецца. Калі ты будзеш сябе добра паводзіць, дык ён яшчэ хутчэй праляціць». Пасля гэтых слоў настрой у дзіцяці прыўзняўся». У класе ў Святланы Міхайлаўны вучацца дзеці з розных сем'яў. «Многім, адчуваецца, дома не хапае ўвагі. Падыдуць, бывае, штосьці спытаць, галаву на плячо пакладуць... Таму я і ўвяла традыцыю — абдымацца кожную раніцу. Заходжу ў клас пасля першага званка са словамі: «Ну, хадзіце, будзем абдымацца». Спачатку ўсе абдымаюцца са мной, потым — паміж сабой. Пасля таго садзяцца за парты задаволеныя, з усмешкамі».*

*Даказана, што абдымкі не толькі выклікаюць станоўчыя эмоцыі, але і, як вітамінкі, павышаюць імунітэт. Менавіта таму педыятры раяць бацькам абдымаць сваіх дзетак як мага часцей. Не так даўно я слухала чарговы вэбінар на бацькоўска-дзіцячую тэму, дзе псіхолаг прапасіла палічыць, колькі разоў у дзень мы цалуем і абдымаем дзіця, а колькі разоў у дзень сварымся і робім яму заўвагі. Калі колькасць першых і другіх дзеянняў прыкладна аднолькавая, трэба як мага хутчэй мяняць суадносіны на карысць абдымкаў і пацалункаў. Бо дзіця, якое не атрымала патрэбную колькасць пяшчоты, можа вырасці агрэсіўным і замкнёным, няздольным на эмпатыю. Паводле даных статыстыкі, амаль 80 % забойцаў і 75 % гвалтаўнікоў у дзяцінстве было пазбаўлена бацькоўскай любові.*

*21 студзеня ва ўсім свеце адзначаецца адно з самых добрых свят — Міжнародны дзень абдымкаў. Згодна з традыцыяй, удзельнікі руху «Бясплатныя абдымкі» выходзяць на вуліцы гарадоў і прапануюць свае абдымкі мінакам. Я таксама гадоў шэсць таму зусім выпадкова прычынілася да яе: выйшла на абед і сустрэла маладых людзей з плакатамі з надпісамі «Давай абнімемся», «Мяняю абдымкі на ўсмешку!». Пасля тых абдымкаў на душы сапраўды стала неяк сонечна, нягледзячы на тое, што на вуліцы было змрочна і марозна. З'явілася свята ў 2004 годзе, прыдумаў яго аўстраліец Хуан Ман. Аднойчы ён прызямліўся ў Сіднэйскім аэрапорце, але там яго ніхто не сустракаў. Малады чалавек засмуціўся, бо вакол усе абдымаліся. Тады ён напісаў на лісце кардону з абодвух бакоў «Free Hugs» («Бясплатныя абдымкі»). Спачатку людзі пазіралі на яго са здзіўленнем і абыходзілі бокам. Аднак потым падышла жанчына. Яна расказала, што раніцай у яе памёр сабака і ёй вельмі хочацца, каб яе хто-небудзь абняў. Хуан так і зрабіў, і на твары жанчыны з'явілася ўсмешка. З таго дня маладыя людзі пачаў прапаноўваць абдымкі тым, хто меў у іх патрэбу. З цягам часу рух «бясплатных абдымкаў» распаўсюдзіўся па ўсім свеце.*

*«Ведаеце, што непакоіць мяне? Свет без абдымкаў!» — казаў канадскі акцёр і музыкант Раян Гослінг. І, як можа падацца на першы погляд, такая пагроза з'явілася падчас пандэміі, калі з-за страху заразіцца каранавірусам людзі пры сустрэчы перасталі абдымацца. Традыцыя абдымацца на вуліцы з незнаёмцамі і сёння, як для мяне, гучыць не надта актуальна, але ж у кожнага з нас ёсць блізкія людзі. Менавіта іх псіхолагі раяць абдымаць часцей без усякай нагоды. Дзякуючы абдымкам адносіны з роднымі зробяцца яшчэ больш цёплымі. Дарэчы, у маёй сям'і ёсць добрая традыцыя: каб дзень прайшоў добра, мы з мужам, сынам і двума катамі пачынаем яго з абдымкаў. Чаго і вам шчыра жадаем. Як мне аднойчы параіў знаёмы псіхатэрапеўт: правядзіце эксперымент, пастарайцеся абдымаць родных некалькі разоў на дзень — праз 30 дзён тэрапіі вы і самі не захочаце адмаўляцца ад гэтага рытуалу.*

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

Сямейная газета

Выпуск № 1 (204)

Вельмі асабістае

# «У МЯНЕ ТОЛЬКІ АДНА МАМА — ТЫ!»

**Дваццаць гадоў таму жыццё Таццяны і Дзмітрыя Патапавых набыло новы сэнс. Здзейснілася іх мара — яны сталі бацькамі. Спачатку ўсынавілі Максіма, а праз шэсць гадоў прывезлі з дзіцячага дома дачушку Ангеліну. Таццяна, папярэдне запытаўшы дазволу ва ўжо дарослых дзяцей, падзялілася сваёй гісторыяй, а таксама страхамі, якія доўгі час яе мучылі...**



**Таццяна ПАТАПАВА прызналася, што са з'яўленнем у яе сям'і Максіма і Ангеліны жыццё набыло больш глыбокі сэнс.**

## «ЕХАЛІ ПА МАЛЕНЬКУЮ ДЗЯЎЧЫНКУ, А ПРЫВЕЗЛІ ВЯЛІКАГА ХЛОПЧЫКА»

Таццяна прызналася, што вельмі хацела мець дзяцей. Але вынасіць у самой не атрымлівалася. У яе была пазаматачная цяжарнасць, потым замерлая, выкідыш.

— А гады ідуць... Падумала, а чаму б не ўзяць немаўля з дзіцячага дома? Вось толькі не ведала, як сказаць пра гэта мужу. Было вельмі страшна... Вырашыла, што зраблю гэта так, каб не бачыць яго вачэй — у цемры. Памятаю, леглі спаць, выключылі святло, і я кажу: «Дзіма, а можа, нам узяць малога з дзіцячага дома?..» — «Давай», — пачула ў адказ. Мне так лёгка стала пасля гэтых слоў, быццам камень з душы зваліўся. Ноч не спалі, ніяк не маглі нагаварыцца. Вырашылі, што возьмем дзяўчынку да годзіка. Але... ехалі ў Віцебск па маленькую дзяўчынку, а прывезлі вялікага хлопчыка. Мы ж не ведалі, што там не ўсіх дзетак можна браць. У кагосьці маці на той момант не былі пазбаўлены бацькоўскіх правоў. Брацікаў і сястрычак нельга было раз'ядноўваць...

Спачатку нам прапанавалі дзяўчынку, але яна была вельмі хваравітая. Мы ж жывём у вёсцы, машыны ў нас не было, падумалі, як будзем вазіць яе па клініках? Тады нам сказалі: «А давайце хлопчыка паглядзім». Мы пагадзіліся. Прачыталі адну гісторыю жыцця, другую, трэцюю. У выніку спыніліся на Максімку, якому на той момант было 2,7. «Ну, пойдзем, паглядзім хлопчыка», — кажуць.

*(Заканчэнне на 3-й стар. «СГ».)*

Урокі псіхалогіі

# ЯК АЙСБЕРГ У АКІЯНЕ

## Чаму ў некаторых жанчын не прачынаюцца мацярынскія пачуцці?



**Здаецца, што гэта аксіёма — любоў да свайго дзіцяці закладзена ў кожнай жанчыне самой прыродай. Аднак у рэальным жыцці часам сустракаеш тых, хто сваімі паводзінамі абвяргае гэта сцвярджэнне, і гісторыя ведае дастаткова прыкладаў «халодных маці». Добра вядома, што Надзея Васіпаўна Пушкіна не адчувала цяпла і пяшчоты да свайго геніяльнага сына Аляксандра. Выдатная паэтка Марына Цвятаева любіла старэйшую дачку Арыядну, сына Георгія і была зусім абыякавая да дачкі Ірыны. Гала (Алена Дзяканава) — муза і жонка Поля Элюара і Сальвадора Далі — вызначалася поўнай адсутнасцю пачуццяў да адзінай дачкі Сесіль Элюар, якую не пажадала ўбачыць нават напярэдадні смерці. Актрыса, вядомая абаронца жывёл Брыжыт Бардо, прызнавалася, што ніколі не адчувала жадання быць маці і пасля нараджэння сына Нікаля лёгка пераклала ўсе клопаты аб ім на сваякоў.**

**Чым тлумачыцца такое стаўленне да сваіх нашчадкаў? Высвятляем гэта з псіхолагам Таццянай ШАРАНДАЙ.**

— Сучасная навука сцвярджае, што мацярынскага інстынкту няма, а ёсць біялагічны фіксаваны комплекс дзеянняў у адказ на прад'яўленне ключавога стымулу — дзіцяці. «Запуск» любові пачынаецца з моманту родаў, калі плод праходзіць па матачных трубах і актывізуе выпрацоўку гармонаў аксітацыну і пралакціну, — кажа спецыяліст. — Менавіта гэтыя нейрамедыятары выклікаюць жаданне абняць, накарміць і аблашчыць немаўля. Цікава, што догляд нованароджанага актывізуе ў прадстаўніц прыгожага полу магутны выкід гармонаў задавальнення. Дадайце да гэтага яшчэ чароўныя шчочкі, вялікія вочкі, «завязачкі» на пухленькіх ножках і ручках. Усё гэта і абуджае матчыны пачуцці. Разам з тым існуе і адваротны механізм. Калі па нейкай прычыне адбываецца гарманальны збой і пачуцці ў жанчыны «не запальваюцца», то можна назіраць сіндром «мёртвай маці».

***— Але матчыны пачуцці не вычэрпваюцца фізіялогіяй?***

— Не. Хоць гэтыя пачуцці генетычна абумоўлены, але фарміруюцца задоўга да зачацця. Сацыяльнае асяроддзе, у якім расце і выхоўваецца дзяўчына, можа істотна паўплываць на яе стаўленне да будучых нашчадкаў. Былі перыяды, калі ў адносінах да дзяцей дамінаваў падыход: «Бог даў — Бог і забраў». Раней нараджалі шмат дзяцей і не смуткавалі з нагоды іх смерці. Часам нараджэнне дзіцяці ўспрымалася нават як пакаранне — лішні рот. Асабіста ведала жанчыну, якая праз усё жыццё пранесла боль ад слоў маці: «У іншых дзеці паміраюць, а ў мяне ўсе жывыя». І ў сучасным грамадстве дастаткова прыкладаў жорсткага абыходжання з уласнымі сынамі і дочкамі.

*(Заканчэнне на 8-й стар. «СГ».)*

# ДАПАМОГА СЛОВАМ,

## або Крызіс падлеткавага ўзросту

**Празмернае ўжыванне касметыкі, перажыванні першага кахання, неразуменне, як «быць дарослым», праблемы ў зносінах з настаўнікамі... Гэтыя і шмат іншых пытанняў вельмі часта непакояць падлеткаў, якія ў сваім імкненні раней пасталець часам ператвараюць свае паводзіны і ўчынкі ў выбухованебяспечную сумесь. Каб разабрацца, што з імі адбываецца, трэба не караць гэтых учарашніх дзяцей — сённяшніх маленькіх дарослых, — а размаўляць з імі, прыводзіць прыклады з уласнага вопыту, даваць магчымасць памыляцца... Праблема ў тым, што часта побач з падлеткам няма аўтарытэтнага чалавека, з якім можна пагаварыць па душах. Бацькі — далёка не заўжды тыя людзі, да якіх можна прыйсці са сваімі праблемамі, а псіхолагі, лічаць падлеткі, «скажуць, што ў цябе з галавой праблемы». Адзін з сучасных і найбольш аптымальных варыянтаў — мадэратары па рабоце з падлеткамі, якія працуюць у межах праекта «тата-школы».**

### СЁННЯШНІЯ ПАДЛЕТКІ — ЗАЎТРАШНІЯ БАЦЬКІ

«Тата-школы» — вядомы многім праект па далучэнні мужчын да актыўнага выхавання дзяцей, які быў распачаты ў Беларусі ў 2009 годзе ў Мінскім гарадскім цэнтры сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей. Члены рэспубліканскай арганізацыі «Клуб ільвоў» у свой час падхапілі эстафету распаўсюджвання свядомага бацькоўства па ўсёй краіне. За гэты час «тата-школы» выйшлі далёка за межы сталіцы, а праект набыў пэўныя кірункі дзейнасці. У прыватнасці, з'явіліся падлеткавыя групы, дзе з хлопцамі і дзяўчынамі займаюцца мадэратары па рабоце з падлеткамі. Чаму? Ды таму, што сённяшні падлетак — гэта заўтрашні бацька, і трэба з маленства тлумачыць яму, што такое адказнасць дарослага, лічыць Міхаіл Шукайла, які ўзначальвае кірунак па рабоце з падлеткамі:

— Спецыялісты Мінскага гарадскога цэнтра сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей за час работы з падлеткамі стварылі метадычны дапаможнік для трэнераў такіх груп. У ім выкладаецца, напрыклад, як заахвочваць падлеткаў да размоў у гульнявой форме, каб не адштурхнуць іх. Тым больш што наша работа па разборы падлеткавых праблем мае ўсё ж прафілактычную накіраванасць. Калі трэнер бачыць у групе падлетка з сур'ёзнымі праблемамі, яго перанакіроўваюць да падлеткавага псіхолага — у Мінскі гарадскі цэнтр сацыяльнага абслугоўвання сям'і і дзяцей або ў Рэспубліканскі цэнтр псіхалагічнай дапамогі.



**ПАРАДЫ АД МІХАІЛА ШУКАЙЛЫ**

Лепш расказваць падлеткам у школе не пра фізіялагічныя зносіны, а пра ўзаемапаважлівыя стасункі паміж дзяўчынкамі і хлопчыкамі, пра адказнасць за прынятыя рашэнні, за свае словы, за дзеянні ў дачыненні да сваіх сяброў і асоб супрацьлеглага полу. І такія заняткі можна арганізоўваць, як толькі скончылі пачатковую школу. А больш старэйшым падлеткам можна прапаноўваць сваю альтэрнатыву — тлумачыць, што яны могуць даць адно аднаму эмацыянальна, а не фізіялагічна. Можа, тады і непажаданых цяжарнасцяў будзе менш.

Важна не падманваць падлеткам, бо яны цудоўна гэта адчуваюць. Лепш самую непрыгожую праўду агучыць шчыра, чым з разумным выглядам «штурхаць узгодненыя і прапісаныя ісціны». Інакш у настаўнікаў і запрошаных спецыялістаў не атрымаецца размовы з вучнямі, не ўдасца данесці карыснае.

Падлеткам трэба памятаць, што ў любое асяроддзе на любым этапе жыцця спачатку трэба ўпісацца, а ўжо пасля пачаць змяняць яго, каб зрабіць лепшым. Як? Трэба самім «насаджаць» пазітыў, каб ён выштурхнуў кепскае.



### КОЛЬКІ КАШТУЕ БЫЦЬ ДАРОСЛЫМ

У самым пачатку трэнінгі з дзецьмі праводзілі ў SOS-дзіцячай вёсцы ў Бараўлянах. Вопыт работы з сацыяльнымі сіротамі, у якіх не толькі складаная жыццёвая сітуацыя, але і вельмі няпростыя падлеткавы перыяд, аказаўся вельмі цікавым, адзначыў суразмоўца:

— Дзяўчаты, праўда, з большым задавальненнем прыходзілі на заняткі. Напрыклад, адным з заданняў было запоўніць сваю анкету на сайце знаёмстваў, каб навучыцца знаёміцца. Калі абагуліць, то ў іх атрымлівалася «прыгажуня, разумніца і проста фея шукае заможнага і пяшчотнага, каб на руках насіў». Я выступаў у ролі «троля» з пытаннем: «Як гэтаму цудоўнаму мужчыну разгледзець цябе сярод натоўпу прыгажунь-разумніц?» Парада ў гэтым выпадку зводзілася да наступнага: «Калі рэалізуешся ў вучобе і прафесіі — з табой як мінімум будзе пра што пагаварыць».

У хлопцаў яскрава вызначыўся недахоп зносін з мужчынамі і недастатковае разуменне мужчынскага свету ўвогуле, бо ў дзіцячай вёсцы прызначаныя матулі самі выконвалі бадай што ўвесь блок гаспадарчых пытанняў. І калі наставаў час хлопчыкам жыць асобна, у іх не было разумення, як пабудаваны дарослы свет. Яны не ведалі, як аплаціць інтэрнэт ці камунальныя паслугі. Дарэчы, такая праблема часам існуе і ў дзяцей са звычайных сем'яў. Аднак у большасці дзяцей-сірот назіраецца проста заслона перад вачыма наконт таго, што такое дарослае жыццё, колькі каштуе быць дарослымі. Яны, напрыклад, хочуць дарагую машыну, але не разумеюць, што пасля не змогуць ёю карыстацца, бо не пацягнуць укладанні на абслугоўванне. І так ва ўсім.

**«Яны, напрыклад, хочуць дарагую машыну, але не разумеюць, што пасля не змогуць ёю карыстацца, бо не пацягнуць укладанні на абслугоўванне».**

— Дзіцяці трэба тлумачыць, што рэаліі дарослага свету вельмі адрозніваюцца ад яго «хацелак». І чым раней ён сутыкнецца з несправядлівасцю, бо дарослы свет — зусім не пра справядлівасць, тым лепш гэта дапаможа падрыхтавацца да сталення і ўмення адказваць за свае словы і ўчынкі.

### ШКОЛА, ПРАФЕСІЯ, НАВЫК

Вялікую ролю ў падрыхтоўцы да дарослага жыцця адыгрываюць школа і зносіны з настаўнікам. Калі педагог не можа растлумачыць прадмет так проста, каб зразумеў не толькі дзевяцікласнік, але і другакласнік, гэта выклікае да яго пэўны недавер, мяркуе Міхаіл.

— Трэба спускацца на ўзровень вучняў, каб максімальна проста ім данасіць сутнасць. І ні ў якім разе не высмейваць — інакш дзіця проста адвернецца ад прадмета. І гэта таксама датычыцца несправядлівасці дарослага свету, бо як і на рабоце, дзе адбываюцца «закулісныя» працэсы, а ў начальства ёсць свае любімчыкі. Аднак там вынікам тваіх учынкаў будзе ўжо не адзнака, а, скажам, страта работы або эканамічная бяспека тваёй сям'і. І тут варта думаць, як, з аднаго боку, адстойваць свае правы, а з другога — не стаць таксічным чалавекам у калектыве. Школа, такім чынам, становіцца падрыхтоўкай да дарослага жыцця.

— Падчас адной з сустрэч ва ўстанове дадатковай адукацыі вучні 6 класа, даведаўшыся, што я кірую фірмай, падрабязна сталі цікавіцца, як стварыць ІП, якія патрэбныя дакументы, што рабіць пакрокава. Яны задавалі пытанні, якія няма каму адрасаваць у іх звычайным жыцці. І нават дзіўна, што бацькі не расказваюць, як, напрыклад, аформіць дакумент на машыну ці нешта яшчэ.

Пытанне прафарыентацыі часта закранаецца падлеткамі на сустрэчах, і трэнер тлумачыць, што можна паспрабаваць сябе шмат у чым, пакуль не знойдзеш занятак даспадобы. Сам Міхаіл у свой час скончыў педуніверсітэт па спецыяльнасці «Арганізацыя фізкультурна-аздараўленчай работы і турызму». За плячыма таксама рэспубліканскае вучылішча алімпійскага рэзерву. Аднак сёння ён раіць падлеткам выбіраць не тое, што «прыгожа гучыць», а тое, што рэальна пракорміць у жыцці. У самога Міхаіла такім уменнем, своеасаблівай падушкай бяспекі стала будаўніцтва.

### «БАЯВАЯ РАЗМАЛЁЎКА» І ПЕРШАЕ КАХАННЕ

Яркі макіяж — таксама адна з праблем школьніц-падлеткаў, якую ні настаўнікі, ні бацькі не разумеюць. Між іншым, такім чынам дзяўчаты намагаюцца схаваць сваю праблемную скуру, часта не задумваючыся, што атрымліваецца замкнёнае кола: чым больш макіяжу на твары, тым больш потым на ім запаленняў.

**«Я выступаў у ролі «троля» з пытаннем: «Як гэтаму цудоўнаму мужчыну разгледзець цябе сярод натоўпу прыгажунь-разумніц?»**

— А яшчэ ў дзяўчат модна апранацца ў стылі «аверсайз», — сведчыць Міхаіл. — І калі касметыку яны цягаюць у мам, то адзенне — у татаў. І вось ідзе па школе такая дзіва ў «баявой размалёўцы», сама — 42 памеру, а байка — 58-га. Гэта смешна для дарослага чалавека, але гэта таксама трэба перажыць і перачакаць.

Вядома, пачынаючы і падлеткавыя перажыванні адносна першага кахання, праблемы з хлопчыкамі. Па канале ТНТ цяпер ідзе перадача «Закахайся, калі зможаш», дзе цудоўна паказана, якімі быць не трэба.

— Сітуацыі, паказаныя гледачам, добра ілюструюць адносіны. «Чаму ён нічога не падарыў мне на Дзень нараджэння?» — пытаецца адна з гераінь. А гэта і ёсць яго «ўчынак», які і паказвае стаўленне, а не прыгожыя словы. Стаўленне да цябе значна важнейшае, чым знешнасць і паводзіны. Апошняе можа быць гульнёй, а ўчынкі не падробіш. І важны этап — знаёмства з бацькамі, бо ім усё ж важна ведаць, з кім сябруе іх дзіця.

У сямейным жыцці адносіны трэба адразу выбудоўваць такім чынам, каб не рабіць памылак. У сям'і заўжды існуе звод правілаў, бо гэта не толькі каханне і сексуальныя жаданні, упэўнены Міхаіл.

— А вось займацца сексуальнай асветай агулам у школах, нават калі гэта будуць спецыялісты, пэўна, не варта, бо на цікавасць да таго ў кожнага свой час. Ведаю выпадак, калі класу на такіх «уводзінах у прадмет» расказвалі, як 11-гадовыя дзяўчынкі займаліся прастытуцыяй на камеру. А хлопчыкі з таго ж класа яшчэ ў машынкі гулялі і ні пра што падобнае не думалі! Так што ў адным і тым жа ўзросце для некага такая гаворка — яшчэ рана, а для іншых — ужо позна. Давайце спачатку навучымся выбудоўваць рэальныя эмацыянальныя зносіны ў рэальным свеце.



**Ірына СІДАРОК.**
**Фота з архіва героя.**

# «У МЯНЕ ТОЛЬКІ АДНА МАМА — ТЫ!»

***(Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар. «СГ».)***

У дзяцей якраз быў ціхі час. Падышлі ціхенька да ложачка, адхінулі коўдру, паглядзелі, захінулі коўдру. Пераглянуліся з Дзімам. «Бяром! Бяром!» Першыя дні ён называў мяне «няняй». Мы з Дзімам пачалі звяртацца адно да аднаго «тата» ды «мама», хацелі, каб малы прывыкаў да гэтых слоў. Памятаю, быў выхадны дзень, я, Дзіма і Максім ляжалі на канапе. Максім кліча мяне: «Няня, няня», а я вочы не расплюшчваю. І тут раптам чую доўгачаканае «мама». Я расплюшчыла вочы, плачу ад шчасця. Усё жыццё, напэўна, буду згадваць гэты момант.

Свет круглы. Неўзабаве пасля таго, як усынавілі Максімку, паехалі да свекрыві — знаёміць з унукам. Там быў Дзімаў брат, які працуе ў Наваполацку ў бальніцы, у дзіцячым аддзяленні. Убачыў наш дзядзька Коля Максіма і кажа: «Гм, дык я ж яго ведаю! Ён у мяне амаль год у аддзяленні жыў».

## ЯК У МАКСІМА З'ЯВІЎСЯ СТАРЭЙШЫ БРАТ

— Мы з мужам адразу вырашылі, што раскажам Максіму праўду пра ўсынаўленне, як толькі ўбачым, што ён гатовы. Але так атрымалася, што ён даведаўся пра гэта ад чужых людзей. Памятаю, мыю посуд (я працавала ў школьнай сталовай кухарам), падбягае на перапынку Максім і пытаецца: «А праўда, што вы мяне з дзетдома ўзялі?» — не без слёз узгадвае Таццяна. — І, не дачакаўшыся адказу, бяжыць далей.

Ужо даўно яна думала пагаварыць на гэту тэму з сынам. Але ніяк не магла падабраць момант. У выніку жыццё падабрала яго само. У той жа дзень Таццяна прызналася васьмігадоваму Максіму, што дзевяць месяцаў ён жыў у жывоціку іншай мамы, пасля апынуўся ў дзіцячым доме, адкуль яго і забралі. Размова прайшла вельмі лёгка, мабыць, таму што Максім быў яшчэ маленькі. А магчыма, і таму, што пра дзіцячыя дамы і пра дзетак, якія растуць там без мамы і таты, чуў не ўпершыню.

— Тады часта па тэлевізары круцілі ролікі пра дзіцячы дом. І Максім пытаўся, што гэта такое. Я расказвала яму, што дзіця ў сям'і можа з'явіцца па-рознаму. Галоўнае, каб сям'я была дружная. Казала, што ўсынаўленне — шчасце для ўсіх, бо дзіця знайшло маму і тату, а яны, у сваю чаргу, доўгачаканага сына і дачку. Нават мара ў Максіма была: прасіў, каб мы прывезлі з дзіцячага дома маленькага брацікa, — кажа Таццяна. — Страшна падумаць, якая магла б быць яго рэакцыя, калі б ён даведаўся праўду ад чужых людзей у падлеткавым узросце.

...Калі афармлялі дакументы на ўсынаўленне, я, прызнаюся, памяняла дзень нараджэння Максіма — зрабіла яго на два тыдні маладзейшым. Ён нарадзіўся напрыканцы 1999-га, а па маіх дакументах — на пачатку 2000-га. Баялася: раптам знойдуцца яго родныя бацькі ці сваякі і захочуць хлопчыка забраць? А потым перажывала з-за гэтага, шкадавала. Перад тым, як Максіму атрымліваць пашпарт, паехала да юрыста даведвацца, ці можна вярнуць яго сапраўдны дзень нараджэння. Сказалі, што нельга. Таму цяпер у яго два дні нараджэння: сапраўдны і несапраўдны. Але тое, чаго я так баялася ўсё адно здарылася.

Неяк Таццяне пазваніла яе маці і кажа: «Дачушка, ты газету бачыла? Там нашага Максіма бабуля шукае». Разгубленая жанчына ўся ў слязах адразу ж пабегла да сяброўкі Святланы — хроснай Максіма, якая выпісвала тую газету. Там сапраўды быў фотаздымак. А на ім — хлопчык, вельмі падобны да Максіма. Бабуля пісала, што часта хварэе і баіцца, што ўнук застанецца адзін на гэтым свеце. Аказалася, яна забрала з дзіцячага дома толькі Максімавага брата Сашу. Баялася, што дваіх не «пацягне». Але на душы ўвесь час было неспакойна, таму вырашыла знайсці малодшага ўнука, каб дзеці ведалі, што яны ёсць адзін у аднаго.

— Мы са Святланай паплакалі разам і вырашылі, што трэба тэлефанаваць, бо інакш рана ці позна гэта зробіць «добразычлівая» суседка. У вёсцы ж усе як на далоні. Бабуля вельмі ўзрадавалася майму званку, запрасіла прыехаць пазнаёміцца. Перад тым, як ехаць, я пасадзіла на калені Максіма, разгарнула газету: «Сынок, глядзі, у цябе ёсць старэйшы брат, ён жыве у іншым месцы з тваёй бабуляй». «Мама, дык, у мяне цяпер тры бабулі і сапраўдны брат! Глядзі, у яго мае вушы». Максім першы час хадзіў задраўшы нос і ўсім расказваў, што ў яго ёсць старэйшы брат, — усміхаецца Таццяна. — Саша прыязджаў да нас на канікулах, вазілі ў Наваполацк і Максімку. Бабуля сказала, што цяпер лічыць мяне сваёй дачкой. Пра біялагічную ж маці і бабуля, і Саша згадвалі неахвотна. Яна п'е, гуляе, а неяк падпільнавала Сашу каля пад'езда і клянчыла грошы.



**Гэты фотаздымак зроблены падчас аднаго з шасці спатканняў з Ангелінай у дзіцячым доме.**

***— Яны хоць і не мае па пашпарце, — кажа сяброўка Таццяны Святлана Бортнік, хросная мама Максіма і Ангеліны, — але я іх люблю як сваіх родных. Памятаю, як прывезлі Таня з Дзімам спачатку Максіма, потым Ангеліну. Такія маленькія, пацешныя. Ну як іх можна не палюбіць? Сваяцтва яшчэ ні аб чым не кажа... У мяне і з Таццянай адносіны бліжэйшыя, чым нават са сваёй роднай сястрой. Мы дзелімся ўсім, як адна сям'я, заўсёды разам і ў радасці, і ў горы. Я з самага першага моманту падтрымлівала Таніна жаданне ўзяць дзетак з дзіцячага дома. І жыццё паказала, што гэта рашэнне было правільным.***



**Дзве мамы — Таццяна і Святлана (хросная Максіма і Ангеліны) — разам са сваімі дзецьмі.**

Дарэчы, гэтым летам Максім упершыню ўбачыў сваю біялагічную маці, пра што расказаў мне сам. У той дзень, калі я размаўляла з Таццянай, Максім якраз прыехаў у вёску на выхадныя з Наваполацка, дзе зараз жыве і працуе, праведаць маму з сястрой.

— У той дзень мы з напарнікам неслі ахову грамадскага парадку на вуліцах горада. Затрымалі мужчыну з жанчынай, якія каля крамы распівалі піва. Прывезлі ў аддзяленне. Напарнік афармляе іх, пытаецца прозвішчы. Чую — прозвішча жанчыны супадае з братавым. Я адразу ж зразумеў, што гэта мая біялагічная маці. Падышоў і кажу ёй: «Як там ваш сын Аляксандр?» — «А вы што, ведаеце мяне?» — «Ну так, — кажу, — начуты». Думаю, цікава, ці памятае яна мяне. Пытаюся: «А як малодшы?» — «Гэта, напэўна, ты, Максім?» Яна не спытала ў мяне, дзе я, што я, як я. Перада мной стаяла жанчына з пустымі вачыма. Ёй было ўсё адно. Пасля гэтага яшчэ аднойчы яе бачыў, таксама ў аддзяленні міліцыі, калі яе затрымалі чарговы раз. І больш не хацелася б.

— Потым, калі Максім прыехаў дадому, я запыталася ў яго: «Што ты адчуў, калі яе ўбачыў?», і пачула ў адказ: «Ды нічога асаблівага, звычайная алкагалічка. Яна мне чужы чалавек. У мяне адна мама — ты».

## «ПРЫСНІЎСЯ СОН, ШТО БУДЗЕ ДЗЯЎЧЫНКА НА ЛІТАРУ А»

— Калі мы вырашылі ўзяць другое дзіця, Максіму было 12 гадоў. Нам па тэлефоне сказалі, што ёсць дзяўчынка Наташа. Прыехалі ў дзіцячы дом. Выводзяць гэту дзяўчынку. Харошанькая такая. Мы гасцінцы ёй прывезлі, пагулялі з ёй дзве гадзіны, развіталіся, выйшлі. «Вы ведаеце, — кажу, — ну не адчула я гэта дзіця». — «Значыць, не ваша». Пасля гэтых слоў мне стала лягчэй. Мы вярнуліся дадому і чакаем зноў. Тут Дзіма кажа: «Мне сон прысніўся, што будзе дзяўчынка на літару «А». Я хуценька на тэлефон, званю ў дзіцячы дом, а мне кажуць: «Учора быў суд, адну маці пазбавілі бацькоўскіх правоў. Дзяўчынку завуць Ангеліна». Мы з Дзімам адразу зразумелі, што гэта наша дачушка.

Памятаю, калі прыехалі першы раз на сустрэчу з Ангелінай, дзеці, убачыўшы нас, падбеглі, абшчапілі з усіх бакоў, — са слязамі на вачах згадвае Таццяна. — А наша не падыходзіць, стаць убаку. Малая, худая, адны вочы. «Ангеліна, глядзі, да цябе мама з татам прыехалі», — звярнулася да яе выхавальніца. Калі Дзіма ўзяў яе на рукі — дзяўчынка заплакала. Аказалася, яна панічна баялася мужчын. Відаць, у яе была нейкая дзіцячая траўма. У мяне на руках яна супакоілася. Мы шэсць разоў прыязджалі на спатканне з Ангелінай, бавілі з ёй час. Больш як месяц жылі ад выхадных да выхадных. Думалі, якія ёй гасцінцы прывезці. Перад тым як забраць яе дадому, я павяла яе на гаршчок. Нейкі хлопчык падбег да мяне, і я яму дапамагала запраўляць майку ў штаны. Ангеліна гэта ўбачыла, прыжмурыла вочкі і кажа: «Мая мама прыехала». Мы яе ўзялі ў 2,7, як і Максіма.

У выніку Ангеліна стала татавай любіміцай. Як толькі бачыла, што Дзіма вяртаецца з працы, заўсёды бегла яму насустрач. Ён садзіў яе на плечы і нёс дадому. Суседскія жанчыны дзіву даваліся: маўляў, колькі дзяцей у вёсцы, але ні аднаго бацьку ніхто так не сустракае. Дзіма ўмеў знайсці падыход да дзяцей, і яны цягнуліся да яго. Прыходзіў з работы, ніколі не ленаваўся, гуляў з малымі ў двары, будаваў крэпасці... Максім ганарыўся, што ў яго такі тата. На жаль, Дзімы цяпер няма побач з намі, ён сышоў у лепшы свет.

А тры гады таму памёр мой тата, і я паехала ў Наваполацк, каб арганізаваць пахаванне. Ангеліне на той момант было дзевяць гадоў. Вяртаюся дадому, тэлефануе мне калега з працы: «Таня, у сталовую прыйшлі дзяўчынкі і кажуць: «А вы ведаеце, нам сказалі, што Ангеліну з дзіцячага дома ўзялі?» Думаю, папярэджу цябе, каб ты ведала, што дзеці ў школе ўжо ў курсе». Тым вечарам я сказала Ангеліне, што «мы з татам вельмі доўга марылі пра дзяўчынку і ўзялі цябе з дзіцячага дома, ты нам так спадабалася!» Я гаварыла і плакала. Ангеліна таксама плакала. «Дачушка, ты пытайся што хочаш, — казала ёй, — толькі не маўчы. Не трымай у сабе. Максіма мы таксама ўзялі з дзіцячага дома». Я ўсё чакала, што Ангеліна будзе задаваць пытанні. Але яна нічога не пыталася. Потым яшчэ і Максім пагаварыў з ёй. Пазней Ангеліна прызналася: «А я здагадвалася, што вы мяне ўзялі, бо чаму ў Максіма брат ёсць, а ў мяне няма?»

## «СЛУХАЙЦЕ ВЫКЛЮЧНА СВАЁ СЭРЦА!»

***— Таццяна, як вы лічыце з вышыні свайго досведу, ці трэба захоўваць тайну ўсынаўлення? І калі і расказваць дзіцяці праўду, то ў якім узросце?***

— Універсальнага рэцэпта няма. Усе дзеці розныя. Але гаварыць трэба абавязкова. Чым раней, тым дзіця ўсё гэта ўспрыме лягчэй. Мы ж усе глядзім перадачы, калі праўду даведваюцца ў пераходным узросце ці ўжо дарослымі... І тады пачынаюцца крыўды, пошукі кроўных бацькоў...

***— Што можаце параіць людзям, якія хацелі б усынавіць дзіця?***

— Гады два таму мне напісала ў «Аднакласніках» адна жанчына. Маўляў, Таня, параіце, што мне рабіць. У яе ёсць адна кроўная дачка, а яна хацела б усынавіць яшчэ і хлопчыка, але муж быў супраць. Я перакананая, што ўсынаўленне павінна быць узаемным жаданнем мужа і жонкі. Калі ёсць яшчэ дзеці, то іх меркаванне таксама трэба ўлічваць. Калі хтосьці адзін супраць, не трэба нават пачынаць, траўміраваць дзіця, ды і свая сям'я можа разбурыцца ў выніку.

Мне неяк сястра сказала: «Таня, навошта ты афарміла ўсынаўленне? Узяла б апякунства, дык дзецям былі б нейкія льготы пры паступленні». У мяне ж ніколі такіх думак не было. Я хацела, каб яны былі мае. Я і зараз бы так зрабіла. Ні аб чым не шкадую. Таму вось мая парада: нікога не слухайце. Ні родных, ні сяброў. Яны хутчэй за ўсё будуць адгаворваць... Казаць пра гены ці яшчэ штосьці... Трэба слухаць выключна сваё сэрца.

Чуткі па вёсцы хутка расходзяцца. Чаго толькі людзі не гаварылі! І што дзеля грошай мы дзяцей узялі. Усім было цікава: а якія ў іх бацькі, якое сапраўднае прозвішча... Ніколі не забудуся, як зімой везла Максімку на санчатах. А тут цёця Маня якраз з дому выйшла і кажа: «Ой, які ж харошанькі хлопчык! На вашага мужа падобны». І так цёпла стала мне ад тых яе слоў. Хацелася б, каб людзі былі больш добразычлівымі, тактоўнымі, каб падтрымлівалі прыёмных бацькоў.

Ведаеце, я не раз чула ад людзей: «Як гэта — палюбіць чужое дзіця?» Але ў мяне такога пытання ніколі не ўзнікала. Думаю, усё залежыць ад чалавека. Мы ж з Дзімам, як толькі прывезлі дзетак дадому, адразу зразумелі, што мы іх бацькі і цалкам нясём за іх адказнасць.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

**Фота з сямейнага альбома гераіні матэрыялу.**

# Хто вінаваты і што рабіць,

## калі «ў дэкальтэ» пачаліся праблемы?

**Плануючы новы год, варта ўнесці ў спіс сваіх грандыёзных планаў бадай ці не самы важны пункт — клопат аб уласным здароўі. У штодзённай мітусні здароўе пастаянна адыходзіць на задні план. Асабліва калі няма ніякіх сігналаў аб тым, што варта ўключыць у штодзённік візіт да доктара. Да апошняга «маўчаць» аб сваіх праблемах і жаночыя грудзі. Між тым, іх догляд — задача кожнай сучаснай жанчыны, якая клапоціцца аб сабе.**

**На жаль, усё часцей «дэкальтэ» прыцягвае ўвагу рознымі новаўтварэннямі, пухлінамі і іншымі праблемамі. Не заўсёды крытычнымі, але таксама непрыемнымі. Самая папулярная з іх — фібраадэнома. Чаму грудзі вартыя клопату і ўвагі, нам расказаў урач-анколаг, загадчык Кансультатыўнага анкалагічнага аддзялення (раённага) Мінскага гарадскога клінічнага анкалагічнага цэнтра Канстанцін ШЫШКО.**



***— Канстанцін Аляксеевіч, як правіла, калі людзі чуюць дыягназ «дабраякасная пухліна», яны не чуюць, што яна дабраякасная, а чуюць «пухліна», таму стрэсуюць і нервуюцца. Што такое «пухліна» з медыцынскага пункту гледжання? Фібраадэнома — гэта пухліна?***

— Пухліна — гэта, груба кажучы, разрастанне пэўнага віду клетак, працэс у выніку парушэння іх росту і рэгуляцыі. Дабраякасная пухліна расце экстэнсіўна — яна рассоўвае тканкі, фарміруе капсулу і не дае метастаз. Злаякасная пухліна расце інвазіўна — прарастае ў тканкі, не фарміруе капсулу і здольная даваць метастазы. Фібраадэнома лічыцца дабраякаснай пухлінай. Але тут уключаецца псіхалогія. Сапраўды, калі чалавек чуе, што ў яго знайшлі пухліну, адразу пачынае думаць пра рак. Але дабраякасныя і злаякасныя пухліны — розныя групы ўтварэнняў. Таму я часта кажу пацыентам: «У вас дабраякаснае ўтварэнне, фібраадэнома». На жаль, ёсць стыгматызацыя, што пухліна — гэта заўсёды дрэнна і страшна. Не, гэта не так.

**«Грудзі — гэта орган-мішэнь. Фібраадэнома, кіста, адэноз — вынік праяўлення нейкага негатыўнага працэсу ў арганізме. Часцей за ўсё, гарманальнага збою, які залежыць ад мноства фактараў».**

***— Калі фібраадэнома ніколі не перараджаецца ў злаякаснае ўтварэнне, навошта яе выдаляць?***

— Мы зыходзім з таго, што ў злаякасную пухліну не перараджаецца класічная фібраадэнома. Але ёсць лістападобная пухліна, якая можа перарадзіцца ў злаякасную. Яна можа быць памежнай, нават сама можа быць злаякаснай. Умоўна кажучы, 80 працэнтаў лістападобных фібраадэном маюць рызыку перараджэння ў злаякасныя, прыкладна 15 працэнтаў — памежныя і каля пяці працэнтаў — першапачаткова злаякасныя. Таму трэба выключыць, што гэта не лістападобная пухліна. І ўсё ж мы перыядычна бачым рак у фібраадэномах. Таму перш за ўсё за фібраадэномай трэба назіраць. Калі яна пачынае хутка расці, неяк мяняецца, яе варта выдаляць. Паказанні да выдалення фібраадэном простыя: хуткі рост, вялікая колькасць, вялікія памеры пухлін, пухліны, якія выклікаюць боль і касметычныя дэфекты. Калі жанчына корміць дзіця грудзьмі, вялікая фібраадэнома можа сціскаць малочныя пратокі, тым самым выклікаючы мастыт. Фібраадэномы невялікіх памераў, якія не растуць, не мяняюцца ў памерах і не псуюць якасць жыцця, павінны назірацца. Але пры ўмове, што мы ўпэўненыя: гэта класічная небяспечная фібраадэнома. Калі яна была пяць міліметраў, а за тры месяцы вырасла да аднаго сантыметра, то гэта ўжо паказчык да выдалення, хуткі рост.

***— А што такое лістападобная фібраадэнома?***

— Ад звычайнай фібраадэномы яна адрозніваецца тканкай, якая ў ёй прадстаўлена. У лістападобнай пухліны больш злучальнай тканкі, трансфармуецца яна не ў рак, а ў саркому малочнай залозы, вельмі агрэсіўную пухліну. Лістападобная пухліна сама па сабе сустракаецца нячаста, займае 0,3 працэнта ад усіх утварэнняў малочнай залозы. Але перыядычна мы з ёй сутыкаемся, аперыруем, у гэтым выпадку часцей за ўсё без аперацыі не абысціся.

***— Ці ёсць сувязь паміж фібраадэномай і кістамі ў грудзях? Як іх адрозніць?***

— Сувязі паміж імі няма. Фібраадэномы не прыводзяць да развіцця кіст (калі толькі яны не сціскаюць пратокі), а кісты не выклікаюць з'яўлення фібраадэном. Яны адрозніваюцца па форме, шчыльнасці, мяккасці. Па УГД выразна бачная розніца. Кіста — гэта поласць з капсулай, запоўненай вадкасцю. Часцей за ўсё, калі кісту пункціраваць, капсула зачыніцца, і пытанне здымаецца. Ёсць складаныя кісты, з імі трэба працаваць асобна, некаторыя з іх трэба выдаляць. Простая кіста, як і класічная фібраадэнома, ніякай бяспекі для арганізма не нясе. Але дыфузна-фіброзная кістозная мастапатыя — гэта, на жаль, праблема сучаснага чалавека.

***— Што такое адэноз? Чым ён можа быць небяспечны? Чаму яго часта называюць перадракавым станам?***

— Калі фібраадэнома — гэта пухліна, то адэноз — гэта разрастанне жалезістага кампанента малочнай залозы, структурнае змяненне тканак. І разглядаецца ён як перадстартавы стан на шляху трансфармацыі дабраякаснага ўтварэння ў злаякаснае. Даказаны ачаговы адэноз лечыцца хірургічна. Груба кажучы, выдаляецца пашкоджаны кавалачак малочнай залозы. Калі зона адэноза 1-2 сантыметры, то касметычна гэта нават не будзе прыкметна. А калі зона адэноза сантыметраў пяць, то, вядома, гэта будзе прыкметна. Затое грудзі здаровыя. Хачу заспакоіць: адэноз, хоць і лічыцца перадракавым станам, не заўсёды прыводзіць да раку. Яго трэба ўважліва назіраць. Але прычыны з'яўлення ў іх амаль аднолькавыя. Толькі фібраадэномы любяць маладых жанчын, а адэноз — старэйшых.

***— Чаму так адбываецца?***

— Грудзі — гэта орган-мішэнь. Фібраадэнома, кіста, адэноз —



вынік праяўлення нейкага негатыўнага працэсу ў арганізме, часцей за ўсё, гарманальнага збою, які залежыць ад мноства фактараў. Захворванні органаў малога таза прыводзяць да гарманальнага збою. Ранняя менструацыя, позні клімакс таксама ўплываюць. Цяжарнасць, выкідышы мяняюць гарманальны фон. Жанчына зацяжарыла, зрабіла аборт, арганізм атрымаў стрэс — і, калі ласка, сустракайце фібраадэному, нават калі да цяжарнасці нічога не было. Ужо ў першыя дні, тыдні цяжарнасці арганізм перастрайваецца на новы лад, працэс запушчаны. А тут яго рэзка спыняюць. Канешне, арганізм можа на гэта адрэагаваць. Гарманальныя кантрацэптывы, зразумела, уплываюць. Таму іх трэба прымаць акуратна і пад кантролем гінеколага. Асноўная прычына з'яўлення ў грудзях утварэнняў — гарманальны збой у арганізме. Пытанне толькі ў тым, чым ён выкліканы: стрэс, адсутнасць цяжарнасці ці яе наяўнасць, паталогія печані, шчытападобнай залозы, наднырачнікаў.

***— Канстанцін Аляксеевіч, растлумачце, калі ласка, механізм уплыву стрэсу на ўзнікненне фібраадэном і іншых утварэнняў у грудзях?***

— Стрэсы бываюць розныя. Калі ў вас у цэлым усё добра, але раніцай вы спазніліся на аўтобус і на працу — гэта таксама стрэс, аднак ён хутка пройдзе. А ёсць хранічны стрэс, пастаянныя перажыванні. Сёння з гэтым сутыкаюцца многія, і гэта праблема, бо хранічны стрэс — прычына розных захворванняў. Вінаваты гармон стрэсу картызол, які выпрацоўваецца наднырачнікамі. Пры стрэсе яго ўзровень павышаецца. Усе гармоны ў арганізме павінны быць ва ўраўнаважаным стане. Калі аднаго зашмат, то парушаецца выпрацоўка іншых гармонаў, у тым ліку і гармонаў, якія адказваюць за здароўе малочнай залозы, і гармонаў гіпофізу. Акрамя таго, пры павышаным гармоне стрэсу парушаецца імунная сістэма, картызол зніжае імунны адказ. А парушэнне гарманальнага фону — гэта і ёсць прычына развіцця фібраадэном і мастапатыі.

***— Пры з'яўленні фібраадэном у грудзях абавязкова знойдзецца чалавек, які скажа: «Народзіш — пройдзе». Сапраўды, пасля родаў утварэнні ў грудзях праходзяць?***

— Спрэчнае пытанне, насамрэч. Сама цяжарнасць, лактацыя могуць паспрыяць росту фібраадэном з прычыны таго, што мяняецца гарманальны фон. Жаночы арганізм запраграмаваны на тое, каб цяжарыць і нараджаць, цяжарыць і нараджаць. Прычым яшчэ стагоддзе таму дзяўчыны пачыналі нараджаць з 17-18 гадоў. Сёння гэты ўзросты ссунуўся. А чалавечы арганізм не настолькі хутка адаптуецца і за стагоддзе сваіх настроек не паспеў памяняць. Ён не выконвае сваю функцыю і пачынае даваць сігналы. Я не думаю, што невялікая фібраадэнома будзе перашкаджаць насіць і карміць дзіця. Калі, вядома, пры цяжарнасці яна не будзе расці. Сёння гінеколагі сталі спакайней ставіцца да фібраадэном. Пры наяўнасці дробных фібраадэном можна рабіць нават ЭКА.

***— А што наконт груднога кармлення?***

— Грудзі павінны выконваць сваю функцыю. Калі жанчына не корміць сваё дзіця грудзьмі, у яе можа з'явіцца фібраадэнома ці адэноз. Але працяглае грудное кармленне, гадоў да трох, таксама можа быць прычынай з'яўлення ўтварэнняў. Нармальнае кармленне грудзьмі — першы год жыцця дзіцяці — ніяк не можа паўплываць на з'яўленне фібраадэном.

***— Як самастойна выявіць у грудзях нейкае ўтварэнне? Гэта ўвогуле рэальна?***

— Рэальна. Можна самастойна намацаць нейкае ўтварэнне ў грудзях. Калі яно шчыльнае, рухомае, гладкае, бязбольнае — хутчэй за ўсё, фібраадэнома. Калі ўтварэнне шчыльнае, дрэнна ссоўваецца, без выразных контураў, звязанае са скурай, тады ёсць прычына турбавацца больш. У любым выпадку, пры знаходжанні нейкага віду ўтварэння абавязкова трэба звярнуцца да ўрача.

***— Калі намацаць немагчыма, па якіх прыкметах можна вызначыць, што ў грудзях нешта ёсць?***

— Звычайна грудзі больш-менш сіметрычныя, і саскі таксама. Калі адзін сасок нармальны, а другі пачаў уцягвацца — гэта званочак. Раптам адна залоза пачала павялічвацца ў памеры, чырванець, ацякаць — таксама прыкмета таго, што нешта не так. Гэта часам можа быць прыкметай раку. З'явілася на скуры грудзей нейкая ямачка, нібы лімонная скарыначка, — таксама непрыемная прыкмета. Як толькі заўважылі нешта нетыповае — адразу трэба звярнуцца да ўрача.

***— У якім выпадку, у якім узросце варта пачынаць сачыць за здароўем грудзей?***

— Пажадана ўжо з падлеткавага ўзросту. Мы аперыруем і 18-гадовых дзяўчат, таму за грудзьмі варта сачыць, як толькі яны вырастаюць. Зразумела, што ў падлеткаў працэнт з'яўлення нават дабраякасных утварэнняў зусім невялікі. Але, тым не менш, працэсы, якія прыводзяць да іх з'яўлення, ужо могуць пачынацца.

***— Канстанцін Аляксеевіч, што вы можаце пажадаць жанчынам у новым годзе?***

— Банальнае пажаданне ад урача — сачыць за сваім здароўем. У мінскіх паліклініках рэгулярна праводзіцца дыспансерызацыя, а ў Ленінскім, Першамайскім, Маскоўскім і Савецкім раёнах сталіцы ў 2022 годзе пачаўся скрынінг раку малочнай залозы, на які запрашаюцца жанчыны ад 50 да 69 гадоў. Велізарная просьба да жанчын — не ігнаруйце такую прапанову. Рак грудзей на першай стадыі выдатна лечыцца, на чацвёртай лечыцца дрэнна. Таму я жадаю кожнаму чалавеку не запускаць сваё здароўе. Мы заўсёды дапаможам, але гэта і ваша адказнасць.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

### КАЛІ І КАМУ ТРЭБА РАБІЦЬ МАМАГРАФІЮ?

Пастанова Міністэрства аховы здароўя ад жніўня 2022 года нумар 83 сцвярджае, што мамаграфію трэба рабіць жанчынам ад 50 да 69 гадоў. Чаму менавіта з 50 гадоў? Шчыльнасць малочнай залозы ў маладых і ў пажылых розная. Пасля 50 гадоў адбываецца інвалюцыя малочнай залозы, і інфарматыўнасць мамаграфічнага метаду ўзрастае. Да 50 гадоў на першым месцы ўсё ж УГД. Мы робім мамаграфію і ў маладзейшым узросце, калі ёсць падазрэнні на злаякасны працэс. УГД і мамаграфія — метады, што дапаўняюць адзін аднаго. Ёсць формы пухліны, якія УГД можа проста не ўбачыць.

Дробязі (асабістага) жыцця

# СЕМ РАЗОЎ АДМЕРАЙ!

## ВОСЬ І ЎСЯ МАРАЛЬ...

«Не вучыце мяне жыць, — любіць паўтараць Таццяна Барысаўна падчас размовы. — Я ўжо навучаная!» І прыгадвае такую гісторыю.

— Было гэта даўным-даўно. Я тады яшчэ ў школу хадзіла, у пяты клас. Аднойчы ў нас захварэла матэматыца, і дзяцей з апошняга ўрока адпусцілі па дамах. Ад школы да дому было зусім недалёка — я дабегла хвілін за дзесяць. Паднялася на чацвёрты паверх, дастала ключы і пачала адмыкаць дзверы... Час быў абедзенны, але бацькі ніколі не прыходзілі дадому на абед — бегалі ў сталоўку кожны на сваім месцы работы або бралі ежу з сабой. Таму ўявіце маё здзіўленне, калі з пакоя нечакана выскачыў... тата. Прычым уражаная я была не толькі яго з'яўленнем, але і выглядам. Увесь нейкі ўскалмачаны, разгублены, у майцы, надзетай задам наперад, і штанах, зашпіленых на адзін гузік. У руках ён трымаў партаманет, з якога тут жа дастаў грошы і нейкім не сваім голасам зададаў, каб я хуценька бегла ў краму па хлеб, бо дома няма ні кавалка, а яму трэба тэрмінова паабедаць і вяртацца на работу. «І цукерак сабе купі!» — дадаў ён, адчыняючы ўваходныя дзверы і выстаўляючы мяне на лесвічную пляцоўку.

**«Муж, калі ў яго прайшоў прыступ рогату, усё растлумачыў, але гэты розыгрыш жонка не магла яму дараваць даўжэй, чым звычайную здраду».**

За спінай клацнуў замок. Уражаная такой «феерыяй», я яшчэ пару хвілін не магла скрануцца з месца. І раптам... Як цяпер бы сказалі, «пазлы сышліся». Усё ж мне было не тры гады, нешта ў гэтым жыцці я ўжо разумела. Замест таго, каб спусціцца ўніз, я паднялася на паверх вышэй і заняла пазіцыю, з якой добра праглядалася наша лесвічная пляцоўка. Чакаць давялося нядоўга. Хвілін праз дзесяць дзверы кватэры расчыніліся, і адтуль выбегла незнаёмая мне дама ў ружовым капялюшыку, зашпільваючы на хаду паліто. Пакуль яна спускалася на першы паверх, бацька, стоячы ў дзвярах, нецярпліва пазіраў на гадзіннік. Праз пару хвілін унізе бразнулі дзверы, усё сціхла, і ён вярнуўся ў кватэру.

Безумоўна, я расказала пра гэта маме, ледзь дачакаўшыся яе вяртання з работы. Калі б ведала, чым усё скончыцца, дзесяць разоў падумала б!.. А тады... Мяне аж распірала ад нецярпення!.. Што было потым? Скандал, слёзы, разбор... У рэшце рэшт, развод, размен кватэры, пераезд... Я засталася, лічы, без таты і вельмі сумавала. Ён быў добры чалавек, заўсёды клапаціўся пра нас з мамай. «Ларысачка, сонейка, коцік», — так да яе звяртаўся. А мяне як шкадаваў!.. І тут усё раптоўна абвалілася... Бацька праз нейкі час пераехаў у іншы горад, потым — у іншую краіну, там жаніўся і праз год памёр. Мама таксама выйшла замуж, але шчаслівай з новым мужам не стала: і раўнаваў, і абражаў, і руку на яе падымаў. Зноў развод. Да гэтага часу жыве адна і ўсё тату ўспамінае — што характэрна, добрымі словамі.

— І якая мараль, Барысаўна? — пытаюцца звычайна суразмоўцы.

— А такая... Я тут нядаўна з крамы вярталася. Вырашыла да наступнага прыпынку пехам прайсці. Бачу — па дарозе кавярня, так прывабна агеньчыкамі зіхаціць. Ну і зайшла — чаму б з марозу гарачай кавы не папіць? Стаю ў чарзе, разглядаю вітрыну, людзей навокал... І тут мяне як токам ударыла — за столікам у дальнім кутку свайго зяця ўгледзела. Сядзіць сабе, каву папівае, ды не адзін, а з маладухай — прывабнай такой бландзінкай, стройненькай, як я сама некалі была. І так яны адно з адным мілуюцца, галоўку да галоўкі прыхіліўшы, так усміхаюцца... Я каўнер наставіла, галаву ў плечы ўцягнула і бачком, бачком да выхаду. Толькі мяне і бачылі! Дадому прыехала, дачка мяне сустрэла, кажа: «Распранайся, мамачка, вячэраць будзем. Толькі Ігарка пачакаем — ён крыху на рабоце затрымаўся, хутка прыедзе!»

— Няўжо не карцела ёй расказаць?

— Няма дурных! Сказала ж: я ўжо навучаная. А можа, гэта яго, Ігарка, калега была, і яны нейкія справы абмяркоўвалі? А можа, аднакласніцу сустрэў — зайшлі па-сяброўску кавы выпіць?.. Ды і ўвогуле... Не тая сям'я шчаслівая, дзе не ходзяць «налева», а тая, дзе не ведаюць, што нехта з іх ходзіць «налева». А для сябе я таксама выснову зрабіла: няма чаго салідным цёткам па кавярнях цягацца! Сядзі дома, глядзі тэлевізар ці ўнукаў няньчы — здаравейшы будзеш. Вось і ўся мараль!



## А ЁН І ПАВЁЎСЯ!

Аднойчы дзве прыяцелькі (адна з іх у хуткім часе збіралася выйсці замуж) выправіліся на вячэрні прамянад. Зайшлі ў кавярню, выпілі па кактэйлі, потым яшчэ па адным, і яшчэ... І тут адной з іх — той, што збіралася замуж — прыйшла ў галаву ідэя. Дарэчы, усялякія «ідэі» пачынаюць раіцца ў жаночых галовах ужо адразу пасля першага кактэйлю. Але гэта зусім не азначае, што іх трэба проста цяпер, не сыходзячы з месца, ажыццяўляць. А тут было выпіта тры порцыі, і стоп-сігнал у выніку не спрацаваў. «А давай мы яго праверым!» — прапанавала без пяці хвілін жонка. «Каго?» — удакладніла сяброўка. «Майго будучага мужа... Бяры тэлефон!»

План быў да крыўднага прымітыўны. Набраць яго нумар, сказаць, што памылілася, знайсці зачэпку, каб прадоўжыць размову і, нарэшце, прапанаваць яму сустрэцца... Ёй, сяброўцы, што? Яна ўзяла і патэлефанавала. Памурлыкала з ім, навешала локшыны пра тое, які ў яго прыемны голас — амаль як у вядомага тэлевядучага. (Мужчыну ж у пацвярджэнне таго, што ён самы цудоўны, шмат не трэба.) Ён і павёўся! І ўгаворваць нават не прыйшлося — праз паўгадзіны прыехаў у кавярню. Папаўся, як той казаў, на гарачым. Патэнцыяльная жонка — у слёзы: маўляў, вось ты які, пралюбадзей няшчасны! А які ж ён пралюбадзей? Проста цікаўны мужчына. У кожным мужчыну, каб вы ведалі, сядзіць дух даследчыка. Яго цікавіць усё новае і неспазнанае. Але гэта зусім не азначае, што ён гатовы аўтаматычна развітацца са старым. І закатваць яму з гэтай нагоды істэрыкі проста сабе даражэй...

Дзякуй Богу, усё скончылася хэпі-эндам, віну сваю малады чалавек загладзіў узорна-паказальнымі паводзінамі. І вяселле ўсё ж адбылося. Толькі вось сяброўку маладая туды не запрасіла. Так ёй, сяброўцы, і трэба — не будзе наступны раз на правакацыі паддавацца.

**«За спінай клацнуў замок. Уражаная такой «феерыяй», я яшчэ пару хвілін не магла скрануцца з месца. І раптам... Як цяпер бы сказалі, «пазлы сышліся».**

## СТРАШНАЯ ЛІТАРА

Ёсць і мужчыны, якіх хлебам не кармі — дай разыграць жонку ў даволі рызыкоўнай манеры. Адзін мужчына (назавём яго І. Разгуляеў) паехаў з калегамі на двухдзённы семінар, які адбываўся на базе пансіянату непадалёку ад вялікага горада. Ужо вяртаючыся назад, мужчына раптам падумаў, што неяк нецікава проста ўзяць і заявіцца дадому без усялякай інтрыгі. Захацелася разыграць жонку. На дапамогу прыйшлі фантазія і шарыкавая ручка. У гэтым пансіянаце наведвальнікам выдавалі квітанцыі. І там было напісана прыкладна так: «Пакой 213. Пражываюць: І. Разгуляеў, М. Вясёлкін». Наш герой проста прыпісаў да прозвішча свайго суседа літарку «а». Квітанцыю ж паклаў у кішэню курткі такім чынам, каб яна пры зручным выпадку абавязкова вывалілася на падлогу ў прыхожай. Так яно і здарылася. Краем вока Разгуляеў заўважыў, што жонка квітанцыю падняла, прачытала і... злёгку змянілася тварам. Але яна была разумнай жанчынай і не адразу ўчыніла скандал. Падчас вячэры яна шмат разоў спытала ў мужа, як прайшоў семінар, хто ўдзельнічаў, хто выступаў... І кожны раз слухала ў адказ, што ўсё было на ўзроўні, але сумнавата, таму што кампанія сабралася выключна мужчынская. «Так ужо і ніводнай жанчыны?» — удакладніла жонка. — «Ды ў каго хочаш запытай!» — шчыра адказваў муж. І тады жонка вырашыла, што надышоў час яе трыумфу. «А гэта што?!» — усклікнула яна, трасучы ў паветры квітанцыяй. — Хто такая гэта твая Вясёлкіна?»

Муж, калі ў яго прайшоў прыступ рогату, усё растлумачыў, але гэты розыгрыш жонка не магла яму дараваць даўжэй, чым звычайную здраду.

## ЗА ШТО «БАРОЛАСЯ»...

Адна разумная жанчына-псіхолаг некалі сказала мне: чым мацней ты будзеш нацягваць «ланцуг», на якім «навязаны» твой мужчына, тым далей ён адляціць, калі вырвецца. Прыкладаў, калі ўзорна-паказальныя бацькі сямействаў раптам з'язджаюць з катушак і пускаюцца ва ўсе цяжкія, колькі заўгодна...

Людміла, мая былая суседка па пад'ездзе, у вольны час любіла пагартаць запісную кніжку мужа, спадзеючыся знайсці там «кампрамат» у выглядзе незнаёмых жаночых імёнаў і нумароў тэлефонаў. Рабіла яна гэта віртуозна, падчас наведвання мужам туалета ці ваннага пакоя, паколькі іншай магчымасці не было — патрэбны блакнот заўсёды ляжаў у яго сумцы. І, як кажуць, за што «баролася», на тое і напаролася: аднойчы ўбачыла незнаёмыя ініцыялы — «П.С.», якія адразу падаліся падазронымі, побач — нумар. Ледзь дачакаўшыся, пакуль муж зноў схаваецца ў запаветнай кабінцы, Людміла кінулася да тэлефона. Але па нумары ніхто не адказаў... Праз некаторы час яна паўтарыла спробу, потым яшчэ раз і яшчэ. Вынік быў той жа — нулявы. Бліжэй да апоўначы, даведзеная да адчаю сваімі ж хваравітымі фантазіямі і да глыбіні душы абураная тым, што нехта асмеліўся пакваціцца на яе «ўласнасць», Людміла вырашыла пайсці ў наступленне. Прыціснуўшы мужа да сценкі (у прамым і пераносным сэнсе), яна хіба што не абцугамі спрабавала выцягнуць з яго імя. Муж не здаваўся — бажыўся, што ўяўлення не мае, каму належаць гэтыя праклятыя «П.С.» Праз гадзіну допытаў ён проста не вытрымаў — скокнуў з балкона, балазе гэта быў першы паверх... Толькі раніцай, гадзін у восем, на тым канцы проваду знялі трубку. Зусім не загадкавы, а раздражнёны жаночы голас паведаміў Людміле, што яна патэлефанавала ў пашпартную службу (што, відавочна, і азначала «П.С.»). Інцыдэнт быў вычарпаны праз хвіліну, а вось муж да Людмілы вярнуўся не так хутка...

**«Не тая сям'я шчаслівая, дзе не ходзяць «налева», а тая, дзе не ведаюць, што нехта з іх ходзіць «налева».**

...Дарэчы, тая мая знаёмая псіхолаг, паводле яе ўласных слоў, ніколі, ні разу ў жыцці не спытала ў мужа: «Дзе ты быў?», кіруючыся мудрым правілам: не хочаш пачуць хлусню — не задавай правакацыйных пытанняў. Самае цікавае, што менавіта муж пачынаў нервавацца з-за гэтай яе «абыякавасці» і хутчэй спяшаўся расказаць пра тое, як прайшоў дзень... Магчыма, крыху хлусіў. «Але ж, — гаварыла яна, — рабіў ён гэта, каб зберагчы МОЙ спакой і НАШЫ адносіны. У рэшце рэшт, усё іншае не так ужо і важна».

Мудрасці гэтай жанчыны можна толькі пазайздросціць...

## АДДАЙ КАЎБАСУ!

У сучасным супермаркеце напярэдадні святаў я блукала ўздоўж бітком набітых прылаўкаў, запаўняючы «спажывецкі кошык» звыклым наборам прадуктаў. І раптам адчула на сабе чыйсьці пільны позірк. Высокі цёмнавалосы мужчына нетаропка ішоў ззаду, маскіруючы сваю здаровую натуральную цікавасць нездаровым пакупніцкім азартам. Я ў малочны аддзел — і ён у малочны, я ў рыбны — і ён тут як тут, перабірае замарожаныя хвосцікі...

**«У кожным мужчыну, каб вы ведалі, сядзіць дух даследчыка. Яго цікавіць усё новае і неспазнанае. Але гэта зусім не азначае, што ён гатовы аўтаматычна развітацца са старым».**

Якой жанчыне не прыемная ўвага прадстаўніка процілеглага полу? Спіну выпраміла, жывот так уцягнула, што да пазванкоў прыліп, падбародак — уверх... Апошні «рубеж» — каўбасны прылавак. Краем вока заўважаю — мой «цень» ужо таксама тут, побач прыладзіўся, усміхаецца.

«Узважце, — прашу ў дзяўчыны-прадаўца, — калі ласка, вунь той сімпатычнай каўбаскі».

Прадавец кладзе на вагі ружовы кавалачак і гучна паведамляе камусьці ў падсобку: «Аляксееўна! Доктарскай больш няма!»

І тут упершыню падае голас мой таямнічы незнаёмец: «Чакайце, чакайце! Як няма? Тады гэта мой кавалак! Я знарок прапусціў жанчыну (г. зн. мяне) наперад, але калі такія справы, няхай будзе па справядлівасці. Давайце каўбасу мне!»

Прадаўцу ўсё роўна — я ж не супраціўляюся. Яна ўзважыла і аддала. Мужчына паклаў каштоўны здабытак у кошык і хуценька пакрочыў да касы.

Я пашкадавала жанчыну, якая калі-небудзь яго пакахае. Калі, канешне, зможа.

**Наталля УЛАДЗІМІРАВА.**

## РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)

**информирует о проведении повторного открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу**

**Аукцион состоится 20.02.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| Лот № 1 | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ № 1: капитальное строение, инв. № 400/С-120238 (назначение – здание специализированное для общественного питания, наименование – кафе), площадью 479,0 кв. м, Гродненская обл., Гродненский район, Индурский с/с, аг. Индура, ул. Гродненская, 2А, с оборудованием (2 отопительных котла).<br>Лот № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 422083605101000275, площадью 0,0786 га (назначение – для эксплуатации и обслуживания здания кафе «Вираж»), расположенном по адресу: Гродненская обл., Гродненский район, Индурский с/с, аг. Индура, ул. Гродненская, 2А.<br>Условия проведения аукциона:<br>- оплату приобретаемого объекта производить путем перечисления денежных средств на расчетный счет Продавца, а также иными способами, не противоречащими действующему законодательству Республики Беларусь;<br>- расходы по государственной регистраций договора купли-продажи, перехода права собственности возложить на Покупателя;<br>- право собственности переходит к покупателю после полной оплаты, передачи объекта и государственной регистрации данного права в РУП «Гродненское агентство по государственной регистраций и земельному кадастру»;<br>- документом, подтверждающим передачу имущества, является акт приема-передачи |
| **Начальная цена продажи** | 171 607,36 руб. (сто семьдесят одна тысяча шестьсот семь рублей тридцать шесть копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 17 160 руб. (семнадцать тысяч сто шестьдесят рублей) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18.<br>**Последний день приема заявлений – 16.02.2023 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 12.03.2022 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/ | |

**РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»**
(Организатор аукциона)
информирует о проведении повторного открытого аукциона с понижением начальной цены на 80 % после очередных несостоявшихся торгов по продаже имущества, принадлежащего **государственному учреждению образования «Институт бизнеса Белорусского государственного университета»**
(Продавец)
Адзін з самых буйных і важных праектаў у вёсцы — гэта стварэнне суседскага культурнага цэнтра. У 2018 годзе Андрэй Уфімцаў выкупіў напаўразбураны будынак Касарыцкага клуба. Раней у яго сценах праходзілі вясковыя сходы і канцэрты, па вечарах круцілі фільмы, нават быў свой хор і вучылі іграць на акардэоне ды баяне. Апошнія 10 гадоў будынак стаяў закінуты, за гэты час яго так расцягалі, што не засталося ні печак, ні падлогі, ні вокнаў.

— Было зразумела, што калі не выкупіць і штосьці з гэтым не зрабіць, то ўсё разбурыцца. Спачатку былі грандыёзныя планы: мы правялі сярод архітэктараў конкурс праектаў на рэканструкцыю клуба, але ў сувязі з пандэміяй нам не ўдалося сабраць грошы на іх рэалізацыю, інвестарам было не да таго. Па дагаворы выкуплены будынак трэба было прывесці ў парадак на працягу трох гадоў. Таму вырашылі не чакаць з мора пагоды, а зрабіць рамонт з улікам таго бюджэту, які ў нас быў (прыватныя інвестыцыі трох чалавек).



Будынак клуба ў пачатку 1980-х.

6 чэрвеня 2021 года аднаўлены будынак клуба адкрыў свае дзверы. Назвалі яго ў гонар Андрэевага прадзеда — «Макар-клуб».

— Думалі назваць на сучасны манер «Макар-club», але зразумелі, што больш правільна захаваць традыцыю. Бо мясцовыя жыхары, колькі сябе памятаю, заўсёды называлі будынак клубам, нават калі ён стаяў у закінутым стане. Дзед Макар быў паважаным чалавекам, прыкладным сем'янінам, меў траіх дзяцей, не піў, не курыў, пражыў сто гадоў. Таму старажылы вёскі яго памятаюць.

На больш як 200 квадратных метрах «Макар-клуба» размясціліся тры музеі, каворкінг (калектыўны офіс, людзі з задавальненнем тут працавалі летам), сучасная бібліятэка, бук-кросінг (абмен кнігамі), грамадская гасціная, куды можна прыйсці пагуляць у даміно, шахматы, кінаканцэртна-выставачная зала. І ўсё гэта для жыхароў вёскі і іх гасцей абсалютна бясплатна.

За паўтара года ў сценах «Макар-клуба» прайшло шмат цікавых мерапрыемстваў, майстар-класаў для дзяцей і дарослых. У прыватнасці, у аднаўленым кінатэатры летась сумесна з Гомельскім кінаклубам правялі першы фестываль плёначнага кіно «Без папкорну», падчас якога ладзіліся ў тым ліку і паказы мультфільмаў. Каб паглядзець фільм Федэрыка Феліні ў плёначным варыянце, у Касарычы прыязджалі людзі з розных гарадоў. Сям'я Андрэя мае калекцыю кінатэхнікі і фільмаў XX стагоддзя і з радасцю дзеліцца гэтымі скарбамі з усімі ахвотнымі.

У «Макар-клубе», акрамя музея кінатэхнікі XX стагоддзя, ёсць яшчэ два музеі. У гістарычным музеі вёскі захоўваюцца фотаздымкі, якія ўдалося выратаваць з закінутых дамоў.

— На жаль, яны там валяліся проста на падлозе. Алічбоўваем іх і развешваем арыгіналы ў рамачках на сценах клуба. Хочам сабраць інфармацыю па кожным доме ў Касарычах, гісторыі сем'яў, архіў дакументаў. Такім чынам захаваць памяць пра вёску таго часу і людзей, якія жылі ў ёй.



У падтрымку кампаніі па аднаўленні даху «Макар-клуба» сябра вёскі Дзмітрый Васілеўскі ўвасобіў вобраз дзеда Макара ў метале.

Акрамя таго, у «Макар-клубе» ёсць музей індзейца з артэфактамі, прывезенымі Андрэем і яго сябрамі-антраполагамі з экспедыцый з Бразіліі, Перу, Мексікі, Гватэмалы, і літаратурай на гэтую тэму. Аналагаў яму няма ў Беларусі нават у горадзе. Таму, кажа Андрэй, менавіта гэта для кагосьці можа стаць нагодай, каб прыехаць у Касарычы.

З самага першага дня «Макар-клуб» пазіцыянуецца як адкрытая грамадска-культурная прастора для падтрымкі творчых ініцыятыў. Любы ахвотны можа сюды прыехаць са сваёй праграмай, правесці лекцыю, выставу ці майстар-клас.

— Мы даём памяшканне «Макар-клуба» ў арэнду на бясплатнай аснове, — удакладняе Андрэй. — У нас не камерцыйная дзейнасць, мы на гэтым не зарабляем, праект цалкам сацыяльны.

Паўтара года таму, калі рамантавалі будынак клуба, у ідэале трэба было і дах мяняць, але бюджэт быў абмежаваны.

— Тым больш будаўнікі, узмацніўшы дах у праблемных месцах, запэўнілі, што ён праслужыць яшчэ шмат гадоў. Так і было б, але... Таму што ў снежні намяло шмат снегу, які спачатку пачаў раставаць, а потым, калі рэзка падмарозіла, ператварыўся ў лёд, то дах не вытрымаў і паехаў... І такая бяда напаткала не толькі нас, у раёне шмат дахаў абвалілася. Клуб пабудаваны ў 1950 годзе. І зараз, калі будаўнікі разабралі дах, выявілася старая праблема: апошні рад бярвенняў, аказваецца, не быў умацаваны. Добра хоць, што ён толькі над кіназалай абваліўся. Слава богу, бібліятэка з рэдкімі кнігамі ды экспанаты нашых музеяў не пацярпелі.

Адразу пасля абвалу даху Андрэй кінуў кліч аб дапамозе ў сацсетках вёскі. Прыязджалі валанцёры з Масквы, Мінска, Бабруйска, Гомеля. Дапамаглі разабраць завал, вынесці мэблю і рэчы з клуба.

— Акрамя таго, мы з хлопцамі падпёрлі столь у кіназале, каб яна не рухнула, расчысцілі снег-лёд, які ляжаў на даху. Мясцовая жыхарка цётка Ганна гатавала для валанцёраў гарачую дамашнюю ежу. Усё, што маглі зрабіць сваімі сіламі на дадзены момант, зрабілі. Далей павінны працаваць спецыялісты. Дзякуючы неабыякавым людзям з Расіі і Беларусі, якія адгукнуліся і пераводзяць нам грошы, удалося закупіць будматэрыялы для замены цалкам усяго даху.

Будаўнікі ўжо ўсталявалі кроквы над кіназалай. Засталося знайсці грошы на тое, каб заплаціць будаўнікам і на само дахавае пакрыццё. У будучыні «Макар-клубу» яшчэ спатрэбіцца самая розная дапамога, у тым ліку, хутчэй за ўсё, давядзецца сваімі сіламі перакладаць падлогу ў кіназале, якая пашкодзілася ад вады і снегу. Сачыць за навінамі можна ў «Інстаграме» ці ў «Фэйсбуку» kosarichi.by.

— Мы ўдзячныя ўсім, хто падтрымаў «Макар-клуб», — кажа Андрэй. — З такой падтрымкай няма сумневаў, што агульнымі намаганнямі ў нас атрымаецца аднавіць дах, і летам мы абавязкова правядзём у «Макар-клубе» другі фестываль плёначнага кіно і іншыя мерапрыемствы для жыхароў вёскі і іх гасцей.

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

**Фота з архіва героя матэрыялу.**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Гродненский филиал)**

**информирует о проведении открытого аукциона по продаже имущества, принадлежащего Гродненскому областному потребительскому обществу**

**Аукцион состоится 20.02.2023 г. в 11.00 по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209. Телефон для справок 55-87-71**

| | |
|---|---|
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ № 1: капитальное строение, инв. № 400/С-164498 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 133,5 кв. м, Гродненская обл., Гродненский р-н, Гожский с/с, д. Польница, ул. Береговая, 22Б. ЛОТ № 1 расположен на земельном участке, кадастровый № 422082408601000190, площадью 0,0365 га (назначение – земельный участок для строительства и обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: Гродненская обл., Гродненский р-н, Гожский с/с, д. Польница, ул. Береговая, 22Б. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель в виде: ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные в охранных зонах электрических сетей, код – 5,2, площадь – 0,0021 га; расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранных зонах рек и водоемов), код – 2.4, площадью 0,0365 га |
| **Начальная цена продажи** | 21 156,00 (двадцать одна тысяча сто пятьдесят шесть рублей) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 2 115 руб. (две тысячи сто пятнадцать рублей) |
| **Наименование, характеристика предмета аукциона, местонахождение предмета аукциона** | ЛОТ № 2: капитальное строение, инв. № 400/С-164903 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 144,7 кв. м, Гродненская обл., Гродненский р-н, Квасовский с/с, д. Дорошевичи, 48А. ЛОТ № 2 расположен на земельном участке, кадастровый № 422084009101000109, площадью 0,0251 га (назначение – земельный участок для строительства и обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: Гродненская обл., Гродненский р-н, Квасовский с/с, д. Дорошевичи, 48А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании земель в виде: ограничения (обременения) прав на земельные участки, расположенные на природных территориях, подлежащих специальной охране (в водоохранных зонах рек и водоемов), код – 2,4, площадью 0,0251 га |
| **Начальная цена продажи** | 22 720,07 (двадцать две тысячи семьсот двадцать рублей семь копеек) с учетом НДС |
| **Сумма задатка** | 2 272 руб. (две тысячи двести семьдесят два рубля) |
| **Реквизиты для перечисления задатка** | BY44BLBB30120500833225001001 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка BLBBBY2X, УНП 500833225 |
| **Место, дата и время окончания приема заявлений** | Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 208, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница). Обед с 12.30 до 13.18. **Последний день приема заявлений – 16.02.2023 г. до 15.00** |
| Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 06.07.2022 г. | |
| Порядок оформления участия в аукционе, порядок его проведения, а также определения лица, выигравшего аукцион, содержатся в информации о проведении аукциона, опубликованной на сайте Организатора аукциона – https://grino.by/auktsiony/ | |

СБЕР БАНК

**Уважаемые Владельцы (физические лица)**

**текущих (расчетных) счетов, в том числе с использованием банковской платежной карточки, благотворительных счетов (далее – Счет), открытых в ОАО «Сбер Банк» (далее – Банк), по которым отсутствуют операции в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету (далее – неактивные счета)!**

Сообщаем Вам, что в соответствии со ст. 206 Банковского кодекса Республики Беларусь банк вправе прекратить обязательства по договору об открытии Счета при соблюдении и наступлении условий, предусмотренных указанной статьей, а также договором об открытии Счета.

Настоящим уведомляем Вас об отсутствии по Вашему Счету операций в течение одного года (кроме зачисления процентов), не включая срока наложения ареста либо приостановления операций по Счету, а также предупреждаем о прекращении обязательств Банка по соответствующим договорам по истечении шести месяцев, начиная с даты настоящего уведомления. Обязательства по договорам текущих (расчетных) счетов с использованием банковской платежной карточки будут прекращены Банком по истечении шести месяцев со дня прекращения срока действия соответствующей банковской платежной карточки.

Если в течение 6 месяцев, начиная с даты настоящего уведомления, Вы не возобновите движение денежных средств по неактивному счету, Банк прекратит обязательства по соответствующему договору и закроет его, перечислив неиспользованный остаток денежных средств на отдельный счет без начисления процентов, и по истечении срока, установленного законодательством Республики Беларусь, зачислит его в доход Банка.

При этом Банк обязуется возвратить по требованию Владельца неактивного счета остаток денежных средств, находившихся на данном счете на момент его закрытия.

В отношении текущих (расчетных) счетов, открытых с 20.05.2020, а также текущих (расчетных) счетов, доступ к которым обеспечивается при использовании банковской платежной карточки, открытых с 05.05.2017 (далее – текущие счета), с 02.11.2020 Банком введен тариф за обслуживание таких счетов в случае отсутствия движения денежных средств на них при наступлении условий, предусмотренных договором об открытии текущего счета.

Операции по Счетам могут совершаться в подразделениях Банка и (или) в системе «СберБанк Онлайн».

**Информацию о режиме работы подразделений можно получить по телефонам:**
**148 – в стационарной и мобильных сетях;**
**(+375 25/29/44) 5-148-148 –**
**в том числе для международных звонков.**

УНП 100219673

УНП 691150277

**ОТЧЕТ**

**Местного благотворительного культурно-исторического фонда памяти Первой мировой войны «Кроки» об использовании средств и имущества фонда за 2022 г.**

Количество учредителей – 2.
Остаток средств на счетах по состоянию на 1.01.2022 г. – 0,62 руб.
Доходы за 2022 год, всего: 635,04 руб.,
в том числе: добровольные взносы – 635,00 руб., % банка – 0,04 руб.
Расходы за 2022 год, всего: 633,40 руб.,
в том числе: на административно-хозяйственные цели – 234,90 руб.,
на общественно-полезные цели – 398,50 руб.
Остаток средств на счетах по состоянию на 1.01.2023 г. – 2,26 руб.
Долгосрочные активы: 11223,7 руб.
Краткосрочные активы: 3861,67 руб.

Предпринимательская деятельность не велась, унитарные предприятия и хозяйственные общества не создавались.

Расходование денежных средств на деятельность, не соответствующую целям и задачам, предусмотренным уставом фонда, не производилось.

УНП 600181536

**ЯНУШКОВИЧСКИЙ СЕЛЬСКИЙ ИСПОЛНИТЕЛЬНЫЙ КОМИТЕТ**
**проводит 23 февраля 2023 года открытый аукцион по продаже земельного участка в частную собственность для строительства и обслуживания одноквартирных жилых домов на территории Янушковичского сельсовета**

| Номер лота, местонахождение земельного участка | Площадь, га | Кадастровый номер | Начальная цена, руб. | Расходы по формированию земельного участка, руб. |
|---|---|---|---|---|
| **Лот № 1 д. Карпиловка, ул. Дружная, У-10** | 0,106 | 623288007101000045 | 5000,00 | 2050,25 рубля + расходы за объявление в СМИ |
| **Лот № 2 д. Карпиловка, ул. Дружная, У-11** | 0,106 | 623288007101000046 | 5000,00 | 2050,25 рубля + расходы за объявление в СМИ |
| **Лот № 3 д. Карпиловка, ул. Дружная, У-12** | 0,1015 | 623288007101000047 | 5000,00 | 2145,96 рубля + расходы за объявление в СМИ |
| **Лот № 4 д. Карпиловка, ул. Дружная, У-12** | 0,0976 | 623288007101000048 | 5000,00 | 2245,81 рубля + расходы за объявление в СМИ |
| **Лот № 5 д. Карпиловка, ул. Дружная, У-14** | 0,1257 | 623288007101000049 | 5000,00 | 1955,10 рубля +расходы за объявление в СМИ |
| **Лот № 6 д. Карпиловка, ул. Дружная, У-15** | 0,1428 | 623288007101000050 | 5000,00 | 1955,10 рубля + расходы за объявление в СМИ |
| **Лот № 7 д. Карпиловка, ул. Дружная, У-16** | 0,15 | 623288007101000051 | 5000,00 | 1955,10 рубля + расходы за объявление в СМИ |
| **Лот № 8 д. Карпиловка, ул. Дружная, У-17** | 0,1069 | 623288007101000052 | 5000,00 | 2628,08 рубля + расходы за объявление в СМИ |
| Конечный срок и адрес приема заявок | 17 февраля 2023 г. до 17.00, Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, 10, Янушковичский сельский исполнительный комитет, контактные телефоны: (801774) 75115, 75199; (8044) 5476442 | | | |
| Дата, время и место проведения аукциона | 23 февраля 2023 г. в 10.00, Логойский район, д. Янушковичи, ул. Школьная, 10, Янушковичский сельский исполнительный комитет, контактные телефоны: (801774) 75115, 75199; (8044) 5476442 | | | |

**Республиканское унитарное предприятие «Центральный научно-исследовательский институт комплексного использования водных ресурсов»**

**УВЕДОМЛЯЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ОБЩЕСТВЕННЫХ ОБСУЖДЕНИЙ**
**проекта Концепции комплексной переработки Водного кодекса Республики Беларусь**

УНП 100262479

Проект документа направлен на реализацию и совершенствование общественных отношений в области рационального использования и охраны водных ресурсов с учетом наработанной практики правоприменения и перспективной практики управления водными ресурсами в условиях изменяющегося климата.

Начало проведения публичного обсуждения – 17.01.2023, окончание – 16.02.2023 включительно. Замечания и предложения направлять на электронный адрес golod@cricuwr.by с пометкой «Общественные обсуждения».

Ознакомиться с проектом Концепции комплексной переработки Водного кодекса Республики Беларусь можно по ссылке http://www.cricuwr.by/public/

Ну і ну!

## «СПЕЦЫЯЛІЗАВАЎСЯ» НА ВЫКРАДАННІ АХВЯРАВАННЯЎ

**На днях у міліцыю паступіла паведамленне ад работнікаў адной з прадуктовых крам Брэста: наведвальнік спрабуе выкрасці скрыню з ахвяраваннямі. На месца неадкладна выбылі супрацоўнікі Дэпартамента аховы, якія і затрымалі мужчыну.**

Устаноўлена, што 29-гадовы жыхар Магілёўскай вобласці, неаднаразова асуджаны за маёмасныя злачынствы, прыехаў у Брэст у пошуках работы. Як паведамляе падраздзяленне УУС Брэсцкага аблвыканкама, ён здымаў кватэру, не мог працаўладкавацца і хадзіў па крамах у Маскоўскім і Ленінскім раёнах абласнога цэнтра ў пошуках урнаў з грашыма, сабранымі на дабрачыннасць.

У момант затрымання ў скрыні было 1200 рублёў. Цяпер вядома аб сямі фактах падобных крадзяжоў на агульную суму каля трох тысяч рублёў. Грошы падазроны траціў на асабістыя патрэбы, у тым ліку азартныя гульні.

Следчымі заведзена крымінальная справа за крадзеж, учынены паўторна. Фігуранту пагражае да чатырох гадоў пазбаўлення волі. Правяраецца яго датычнасць да аналагічных злачынстваў.

## ЛЯСНЫ БУНКЕР З АРСЕНАЛАМ

**Днямі ўчастковаму інспектару Гродзенскага РАУС патэлефанаваў мужчына і паведаміў, што знайшоў часткі баявой зброі, як мяркуецца, часоў Вялікай Айчыннай вайны.**

Грамадзянін растлумачыў, што гуляў з сынам у лясным масіве паблізу вёскі Гібулічы і ў падземным бункеры сын выявіў часткі прадмета, які візуальна нагадвае баявую зброю, а таксама боепрыпасы. Падрабязнасці здарэння паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Гродзенскага аблвыканкама.

На месца здарэння неадкладна выбылі супрацоўнікі РАУС, і інфармацыя пацвердзілася. Падчас агляду бункера былі выяўлены састаўныя часткі зброі, корпус ад мінамётнай міны, дэталі вінтоўкі, узрывальнікі і кольцы ад гранат, больш за 200 гільзаў, а таксама 35 патронаў. Пасля канфіскацыі прадметы накіравалі на судовую балістычную экспертызу ў Гродзенскі міжраённы аддзел Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз. Праводзіцца праверка.

Праваахоўнікі нагадваюць грамадзянам, што ў выпадку выяўлення падазроных прадметаў трэба неадкладна паведаміць пра гэта ў міліцыю. Прадпрымаць штосьці самастойна не варта. Гэта можа прывесці да неспрыяльных наступстваў.

## НА «ЛІПАВЫХ» ПРАВАХ СТРАЦІЛА РЭАЛЬНЫЯ ГРОШЫ

**18-гадовая жыхарка Слуцка натрапіла ў сацсетках на рэкламу заманлівай паслугі: абяцалі вырабіць пасведчанне кіроўцы, вядома ж, «афіцыйна, праз аддзяленне ДАІ і з фіксацыяй у базе». Падкупляў і дзясятак станоўчых водгукаў ад карыстальнікаў, праўда, звязацца з імі было немагчыма, бо ўсе даныя ўладальнікаў акаўнтаў былі схаваны. Што было далей, паведамляе аддзяленне інфармацыі і грамадскіх сувязяў УУС Мінскага аблвыканкама.**

Стасункі адбываліся выключна ў месенджары, тэлефонных званкоў і сустрэч не было. Пасля таго, як дзяўчына скінула свае асабістыя даныя, фатаграфіі і копіі іншых дакументаў, спатрэбілася аплата «паслугі». Спачатку яна пераявіла на ўказаны банкаўскі рахунак 600 рублёў, праз некалькі дзён — яшчэ 550. На гэтым перапіска спынілася, а рахунак быў выдалены. Натуральна, што пасведчання кіроўцы дзяўчына так і не атрымала і звярнулася ў міліцыю.

Па факце махлярства следчымі заведзена крымінальная справа.

У міліцыі нагадваюць, што афёра з фальшывым пасведчаннем выявіцца пры першым жа прад'яўленні сумнеўных дакументаў інспектару ДАІ. А гэта ўжо крымінальны артыкул. Пакаранне пагражае як прадаўцу «ліпавага» дакумента, так і пакупніку. Згодна з артыкулам 380 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь, за падробку, выраб, выкарыстанне або збыт падробленых дакументаў, штампаў, пячатак і бланкаў максімальнае пакаранне парушальнікам — да трох гадоў пазбаўлення волі. Пасведчанні кіроўцы выдаюцца толькі ў Дзяржаўтаінспекцыі, а ўсё астатняе — гэта банальны спосаб «разводу» на грошы, нагадваюць праваахоўнікі.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

# «Можа, другую кагосьці мамай называеш...»

## Завочнае вяселле, разлучаныя двайняты і іншыя таямніцы сям'і Піліпа Пестрака



**«— Вецер на дарогах звёў нас. Шалёны вецер. Няма нічога дрэннага без добрага...»**
**Так звяртаецца да любай дзяўчыны герой рамана Піліпа Пестрака «Сустрэнемся на барыкадах», у якім распавядаецца пра змаганне ў Заходняй Беларусі супраць польскай акупацыі.**
**У творах Пестрака шмат аўтабіяграфічнага... І гэтую рэпліку ён цалкам мог сказаць сваёй любай жанчыне, спадарожніцы жыцця.**
**Чалавекам ён быў неардынарным. Падчас Першай сусветнай вайны яго сям'я эвакуіравалася ў Самарскую губерню. Там і вучыўся, пасля рэвалюцыі нават быў студэнтам сацыяльна-гістарычнага факультэта Самарскага ўніверсітэта... Але ў Паволжы пачаўся голад, у 1921-м сям'я вярнулася на Беларусь... І апынулася ў панскай Польшчы.**
**Піліп Пястрак стаў актывістам беларускага вызваленчага руху. У польскіх турмах ён правядзе адзінаццаць гадоў.**
**Шмат яркіх старонак біяграфіі, пра якую не пачытаеш у энцыклапедычных артыкулах і хрэстаматыях, распавядаюць архівы... Давайце разам зазірнём у дакументы з фонду Піліпа Пестрака.**

### Камеры на розных паверхах

У фондзе захоўваюцца ўспаміны жонкі пісьменніка, Анастасіі Сцяпанаўны Пестрак, напісаныя ў 1985-м.

Дзяўчына таксама была ў камуністычным падполлі, змагалася супраць польскіх акупантаў ва Украіне. Была бясстрашнай і мужнай. *«Аднойчы ўначы паліцыя ўварвалася ў маю кватэру, пачала весці допыт... пыталася, дзе знаходзяцца падпольшчыкі, якія ў іх паролі, задавала шмат іншых пытанняў, на якія я не адказвала. Тады яны ўжылі фізічную сілу, пры гэтым пашкодзілі пазваночнік, я страціла прытомнасць і была паралізавана».*

На шчасце, Анастасія вылечылася... Але гэта была не апошняя яе траўма. У 1935 годзе было прынятае рашэнне адправіць адважную падпольшчыцу на вучобу ў партыйную школу ў Савецкі Саюз. За два дні да ад'езду, калі дзяўчына праводзіла сход у сяле, яе схапіла паліцыя. Пачаліся дні пакутаў і няскоры. У 1937 годзе рэвалюцыянерку перавялі ў гродзенскую турму.

*«Ніжэй паверхам, пад нашай камерай, сядзелі нашы хлопцы. Перад сном яны таксама паўтаралі тое, што днём вучылі, а часамі распавядалі анекдоты, смяяліся. У камеры разам з Піліпам Пестракам сядзелі і іншыя беларускія пісьменнікі і паэты — Валянцін Таўлай, Якуб Міско, Радзюк. Піліп Пестрак быў вялікі аматар песень. Ён ведаў іх шмат — беларускіх, рускіх, украінскіх, польскіх. У яго быў добры голас. Як толькі ён запяваў ціхую песню, у камеры адразу ўсталёўвалася цішыня, усе слухалі, стаіўшы дыханне, нават некаторыя наглядчыкі стаялі і слухалі. Адзін з іх сказаў Пестраку, што яму трэба было выступаць у тэатры, а не сядзець у турме».*

Ці не з тых песень пачалося захапленне Анастасіі беларускім змагаром?

Пестрак адседжваў тэрмін пасля чацвёртага арышту. Як піша Анастасія, падчас першага арышту за пераход польска-савецкай мяжы ў паліцэйскім участку яму пашкодзілі слых, а праз некалькі дзён ён згубіў валасы. Расказваў — як правядзе рукой па галаве, у руцэ прыгаршча валасоў застаецца... Так і застаўся да канца жыцця лысы. У турме захварэў на сухоты.

Піліп вучыў вязняў матэматыцы, гісторыі, граматыцы, пісаў лекцыі, якія рассылаліся па турме. Анастасія ўзначальвала жаночы камерны камітэт. І Анастасія, і Піліп складалі вершы. Пестрак занатоўваў іх кавалачкам цэглы на цэментнай падлозе. Меў пры сабе мокрую анучу — каб, калі што, сцерці радкі... На жаль, не ўсё з тых сцёртых вершаў удалося пасля аднавіць у памяці.

### Камсамольскае вяселле ў вязніцы

Піліп і Анастасія пазнаёміліся асабіста ў канцы 1937-га, убачылі адно аднаго праз турэмныя краты.

*«Спачатку я не надавала гэтаму знаёмству асаблівага значэння. Потым я атрымала ад яго запіску, з якой даведалася аб яго сур'ёзных намерах. Неяк ён напісаў мне, што яго вызваляюць на чатыры месяцы раней за мяне, і што ў дзень майго вызвалення ён прыдзе мяне сустракаць, а там паглядзім, што будзе далей. Тады ён яшчэ не ведаў, што мяне чакаюць яшчэ два суды.*

*Цягам двух апошніх гадоў Піліп Сымонавіч заўсёды намагаўся паглядзець праз краты на мяне, калі я з другімі жанчынамі выходзіла на прагулку.*

*Весці перапіску нам было вельмі цяжка, але мы ўсё-ткі знаходзілі выйсце з такога становішча. Хоць мы пісалі запіскі адно аднаму рэдка, але ў кожнай з іх было столькі цяпла, пяшчоты і добрых пачуццяў, што ўспамінаю пра іх і па сённяшні дзень».*

Дні зняволення ўсё цягнуліся... Аднойчы ў камеру, дзе сядзела Анастасія, наглядчыкі кінулі слёзатачывую бомбу — і доўга назіралі, як вязні пакутуюць ад газу. Неяк Анастасія як завадатарка галадоўкі трапіла ў карцар. Выратаваў кавалачак хлеба з салам, які ёй умудрыліся перадаць.

Уяўляеце, якая была падзея для беларускіх змагароў, калі ў Гродзенскай вязніцы адбылося камсамольскае вяселле? Прычым жаніх і нявеста бачыліся толькі здалёк.

Пра рамантычныя адносіны паміж дваімі зняволенымі даведалася начальства... Да Анастасіі прыйшоў наглядчык, пачаў распытваць пра беларускую інтэлігенцыю — Тарашкевіча, Дварчаніна ды іншых. Дзяўчына маўчала... *«Тады ён загаварыў пра П. Пестрака, назваў яго маім мужам і сказаў, што мы маглі б жыць у Варшаве, як прыстойныя паны. Напачатку я разгубілася, потым узяла сябе ў рукі і сказала, што сямейныя пытанні рашаюцца ў сваім доме, на што наглядчык мне адказаў: «Калі вы не пакінеце палітыку, то ваш дом — вечная турма».*

### Першы дотык

Невядома, як скláліся б лёсы Анастасіі і Піліпа, але надышоў 1939 год. 17 верасня Чырвоная Армія вызваліла Заходнюю Беларусь. Вязні пачалі выломваць замкі на дзвярах камер. Пестрак стаяў ля рашоткі турэмнага калідора, калі ўбачыў сваю Анастасію і паклікаў яе, працягнуў руку праз краты. «І так упершыню нашы рукі даткнуліся адна да адной».

Вязні пакінулі турму. Радасны натоўп рушыў у бок паліцэйскага ўчастка. Анастасія ішла побач з Піліпам. Пра што нават аб'явілі па радыё — нехта асвятляў падзеі анлайн: «Пестрак з жонкай ідуць у першых шэрагах».

А былі ў іх усяго толькі адзін дотык рукі...

Але ўсё ледзь не скончылася трагічна... У горад ізноў увайшла польская армія, амаль усіх вязняў вярнулі ў турму... Пестраку пагразілі, што будуць выпальваць зорку на спіне... А Анастасіі давялося на свае вочы пабачыць дакумент, у якім загадвалася ў ноч з 17 на 18 верасня расстраляць палітычных зняволеных жанчын на вачах у мужчын, а потым і астатніх камуністаў і камсамольцаў.

Прысуд спазніўся на сорак хвілін. Чырвоная Армія зноў, на гэты раз канчаткова, вызваліла Гародню.




### Два жалезныя лыжкі і дзве падушкі, набітыя саломай

Пачалося новае жыццё... Так здарылася, што Анастасія нейкі час працавала перакладчыцай у турме і ўдзельнічала ў допытах сваіх нядаўніх наглядчыц і катаў.

Яшчэ цікавы эпізод з успамінаў: *«У хуткім часе пасля вызвалення прыехалі ў Гродна беларускія пісьменнікі: Змітрок Бядуля, Міхась Лынькоў, Аркадзь Куляшоў, Пятрусь Броўка. Сустрэліся яны з Піліпам Пестракам, вядуць вясёлыя размовы, жартуюць, смяюцца, потым папрасілі Пестрака, каб вёў да сябе на кватэру. Пестрак прамаўчаў, не ведаючы, што адказаць. Яны яшчэ раз паўтарылі, і тады Пестрак вымушаны быў сказаць: «Дарагія таварышы, я яшчэ знаходжуся ў турме разам з жонкай». Яны глядзяць на яго і не разумеюць, у чым справа. Потым гавораць: «Чаму вы знаходзіцеся ў турме? Вас жа ўсіх вызвалілі!» Пестрак адказаў, што мы на волі, толькі яшчэ не маем кватэры, потым са смехам дадаў, што таму яшчэ даводзіцца даседжваць».*

Літаральна на наступны дзень нядаўнім вязням выдзелілі кватэру.

Анастасія ўзяла пад распіску ў турме два жалезныя лыжкі, два матрацы і дзве падушкі, набітыя саломай, а таксама дзве жалезныя місы і два кубкі.

Вось і ўся маёмасць, з якой маладыя засяліліся ў двухпакаёвую кватэру.

Яшчэ ўспамін... Ішлі рынкам, Пестрак пабачыў, як нейкі мужчына прадае гітару... *«Піліп Сымонавіч узяў гітару і пачаў іграць. Яго худыя змучаныя пальцы ўмела хадзілі па струнах гітары. У тую ж хвіліну яго абкружылі людзі, слухалі і глядзелі на яго захоплены і ўсмешлівы ад радасці твар.*

*Мы прыйшлі дадому, і ў нашым доме пачала ажываць музыка. Піліп Сымонавіч іграў, а я яму падпявала».*

Дома сужэнцы не адседжваліся. Пестрак стаў дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР, старшынёй секцыі Саюза пісьменнікаў. Яго жонка таксама была абраная дэпутатам на Валыншчыне, але засталася жыць на Беларусі.

### Немаўляты на ваенных дарогах

А ў маі 1941 года — радасная падзея: Анастасія нарадзіла двойню! Хлопчыка і дзяўчынку, Ніну і Толю. Уявіце, якія шчаслівыя былі бацькі!

А праз месяц пачалася вайна.

Піліп і Анастасія пакінулі Гродна ў першы ж дзень, 22 чэрвеня. Ішлі пешкі, з дзецьмі на руках. З імі рушыў знаёмы доктар па прозвішчы Эпштэйн. Ён узяўся несці аднаго з немаўлятак, дзяўчынку. Не было з сабою ніякіх ванзэлак, толькі запас пялюшак — думалі ж, што пакінулі горад толькі на час бамбёжкі, а потым вернуцца... Але вельмі хутка зразумелі — назад вяртацца нельга.

Дайшлі да ўскраіны Ліды, спыніліся каля калодзежа папіць вады. А там — цэлы натоўп. Бежанцы, вайскоўцы...

У гэтым натоўпе Пестракі неяк згубілі доктара Эпштэйна з іхняй месячнай Нінай на руках. Чакалі, чакалі ля калодзежа... Вось ужо і людзі разышліся... Доктара няма. Зразумелі, што Эпштэйн пайшоў наперад.

Устрывожаныя бацькі кінуліся даганяць. У кожнай вёсцы пыталіся, ці не бачылі там старога з маленькай дзяўчынкай на руках? І знайшоўся след! У адной вёсцы гаспадыня ўспомніла — начаваў такі старэнькі дзядок з немаўляткам... У дзяўчынкі такі ж накоўдранік, як у хлопчыка, што з Пестракамі. Накоўдранікі прыкметныя, іх для двайнятак шыла маці, з любоўю, аздабляючы карункамі...

Але Ніну так і не знайшлі.

Пестракі з маленькім Толікам рушылі далей, у бок Палесся — спадзяваліся, што мясцовыя балоты спыняць акупантаў...

*«Дзіця я прывязвала да сябе, каб не згубіць у балоце. Прахадзілі праз сёлы. У многіх месцах ад іх засталіся толькі цагляныя трубы і жалезныя абгарэлыя прадметы хатняга побыту, перамяшаныя з попелам, і яшчэ... кошкі, што выпадкова засталіся жывымі. Як яны жаласна мяўкалі і беглі за людзьмі!»*

Пестракам з маленькім Толікам удалося трапіць у партызанскі атрад генерала Сабурава. Піліп выдаваў там газету «Партызанская праўда». Потым Анастасію з сынам вывезлі ў Маскву...

Але няшчасныя бацькі не трацілі надзеі знайсці сляды згубленай дачкі. Пра доктара Эпштэйна казалі, што загінуў у гета, а Ніну дзесьці пакінуў....

І вось у 1957 годзе звестка: нібыта Ніну з дзіцячага дома ў Лідзе забрала жанчына, якая пасля вайны з'ехала з ёю на сваю радзіму ў Омск. Дзяўчынку прыёмная маці назвала Таняй.

### Ты стаяла прада мною, спусціла косы русы...

Анастасія і Піліп адразу паехалі ў Омск. Пабеглі ў школу, дзе вучылася Таня. Распавялі пра ўсё дырэктару... Дамовіліся — пакуль нічога не казаць дзяўчынцы, а запрасіць яе разам з сяброўкамі да дырэктара нібыта па нейкай справе.

Але калі Таня прыйшла, няшчасная маці не змагла падняць на сваю магчымую дачку вачэй... Тады папрасілі настаўніцу ўзяць Таню і яшчэ адну дзяўчынку, прайсці з імі па калідоры, каб Анастасія магла ўсё-такі пагладзець і вызначыць, ці можа Таня быць яе дачкой... Сэрца маці хацела верыць. На наступны дзень Анастасія нават трохі паразмаўляла з Таняй... Можна ўявіць, як старалася стрымацца, не заплакаць..

Пестракі наведалі прыёмную маці дзяўчынкі. Тая таксама плакала, прасіла не забіраць дачку... Вырашылі, што пакуль трэба шукаць дакументы, якія пацвердзілі б, што Таня — гэта і ёсць згубленая Ніна... Бо пэўнасці ж не было — паспрабуй пазнаць у сямнаццацігадовай дзяўчыне месячнае немаўля!

Пестрак пачаў ездзіць па архівах... Анастасія адправілася ў Лідскі дзіцячы дом. Там ёй распавялі, што дзяўчынку разам з яшчэ трыма немаўлятамі прынёс у дзіцячы дом доктар з раддома — выхапіў з агню пасля бамбёжкі. У Тані была апаленая шчака. Доктар сказаў, дзяўчынка — з двайні, яе маці загінула.

Гэтыя звесткі яшчэ больш усё заблыталі... Так да канца Піліп і Анастасія не ўпэўніліся, ці была Таня іх Нінай. І, наколькі можна зразумець, дзяўчынка з Омска пра сваё магчымае паходжанне не даведалася.

*«Але чыя б Таня ні была дачка — наша ці другіх бацькоў — я супакойваю сябе тым, што трапіла яна да добрых людзей, вырасла прыстойным чалавекам. Зараз яна працуе ўрачом. А ў маім сэрцы яна засталася назаўсёды, і пра яе я пішу такія словы:*

***Шукаю дачку***
*Памятаю, маленькую*
*Цябе спавівала.*
*Тады сонца не свяціла,*
*Зоры не ігралі.*
*Тады цябе, маленькую,*
*Ад мяне забралі.*
*Ад сэрца адарвалі.*
*Нічога не знаеш,*
*Можа, другую кагосьці*
*Мамай называеш.*
*...Шэпча белая бярозка,*
*Не хоча сказаці:*
*«Там, далёка твая дачка,*
*А ты не маці».*
*Ты стаяла прада мною,*
*Спусціла косы русы.*
*Ты пытаеш, адкуль я:*
*«З Мінска? З Беларусі?»*
*Твае рукі пазнавала,*
*Што магу сказаці:*
*«Ад вайны семнаццаць год —*
*Не магу пазнаці.*
*Твае вочы пазнавала,*
*Пяшчотны румянец.*
*Я нічога не сказала,*
*Каб сэрца не раніць».*

Дарэчы, у гэтых старонак успамінаў ёсць другі варыянт, відаць, больш ранні, з праўкамі. Там замянянецца прозвішча жанчыны, якая ўдачарыла дзяўчынку з Лідскага дзіцячага дома, і імя той дзяўчынкі. Напэўна, каб іх не трывожыць, каб захаваць ад Тані гэтую трагічную гісторыю. Трохі папраўлены і верш «Шукаю дачку», які, дарэчы, напісаны на беларускай мове. Піліп Пестрак гэтыя праўкі ўнесці ўжо не мог — ён памёр у 1978 годзе.

**Людміла РУБЛЕЎСКАЯ.**

## Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# Як праверыць насенне на ўсходжасць

*(Заканчэнне.*
*Пачатак у нумары за 12 студзеня.)*

Выходзіць, калі ўпакоўка насення не парушана, яно застаецца сухім і правяраць у вадзе асаблівага сэнсу няма. Варта калібраваць толькі па вонкавым выглядзе. І, пасля адбракоўкі відавочна непрыдатнага, правяраць пакінутае на ўсходжасць.

У хатніх умовах гэта робіцца двума спосабамі: прарошчваннем на вільготнай анучцы або выпрабавальным пасевам у зямлю.

**Спосаб 1. Прарошчванне.** З насення, якое прайшло каліброўку, выбіраем дзесяць штук, каб потым было больш зручна падлічваць працэнты. На спод кладзём складзеную ў некалькі пластоў сурвэтку (ці туалетную паперу, папяровы ручнік, некалькі ватных дыскаў) і апырскваем яе з пульверызатара. Раскладваем насенне і накрываем зверху такой жа сурвэткай. Ставім сподак у цёплае месца (18—22 °С) і падтрымліваем вільготнасць. Насенне не павінна плаваць у вадзе, але і перасыхаць яму таксама нельга. Праз пэўны прамежак часу падлічваем, колькі насення праклюнулася. Час усходжасці ў кожнай канкрэтнай культуры свой.

**Спосаб 2. Пробны пасеў.** Трэба гэтак жа адабраць дзясятак штук і пасеяць іх у грунт. Для дробнага насення цалкам дастаткова разрыхліць баразёнку ў кветкавым чыгуне, раскласці і злёгку прысыпаць зямлёй. Або запоўніць вільготным грунтам невялікі пластыкавы кантэйнер, пасеяць, накрыць плёнкай і паставіць у цёплае месца. Буйное насенне накшталт гароху, кабачкоў або гарбузоў можна прарошчваць у пілавінні. Для гэтага пілавінне некалькі разоў апарваюць кіпенем і вільготным раскладваюць у пластыкавыя кантэйнеры. Насенне раскладваюць, прысыпаюць пілавіннем і крыху ўтрамбоўваюць. Пасля чаго кантэйнеры накрываюць плёнкай і ставяць у цёплае месца. Застаецца пачакаць некалькі дзён (тэрмін усходжасці) і падлічыць усходы.

Такім чынам, калі наша праверка паказала, што ўсходжасць насення 30 % або ніжэйшая (гэта значыць узышло не больш за тры зярняткі з 10), сеяць гэтым насеннем не рэкамендуецца. А калі ўсходаў восем, дзевяць ці ўсе дзесяць, то можна спакойна сеяць без усялякай папярэдняй падрыхтоўкі. А што рабіць з сярэднімі вынікамі? Што рабіць, калі насенне апынулася з 50- ці 60-працэнтнай усходжасцю? Тут у нас ёсць два шляхі. Першы — пасеяць у два разы больш, з запасам. Другі — выкарыстоўваць разнастайныя метады перадпасяўной падрыхтоўкі.

# Вырошчваем зялёную цыбулю дома

Зеляніну цыбулі вельмі проста можна вырасціць у пакоі. Для гэтага бяруць буйную сеянку, дробныя (але не хворыя) цыбуліны і замочваюць іх на 1-2 сутак у цёплай вадзе. Перад высадкай абразаюць шыйку або робяць некалькі вертыкальных надрэзаў верхавіны цыбуліны. Укладваюць, злёгку ўціскаючы ў загадзя падрыхтаваную глебу, густа, адну цыбуліну побач з другой. Прысыпаць зверху глебай не варта.

Паліваць зялёную цыбулю трэба праз 3-4 дні. Першыя 10—12 дзён скрыні з цыбулінамі можна захоўваць нават у цемры, але пры тэмпературы не ніжэй за 18—20 °С. Затым выставіць на святло. Збіраюць зеляніну выбарачна, зрываючы крайнія, больш магутныя лісты або прарэджваючы «градку» шляхам выдалення часткі цыбулін. Пры недахопе пасадачнага матэрыялу можна карыстацца адной закладкай цыбулін на працягу 1,5—2 месяцаў.

Атрымаць зеляніну можна і без глебы, выкладваючы цыбуліны шчыльна ў неглыбокія скрыні, заліўшы іх напалову цёплай вадой. Па меры выпарвання і расходавання вады раслінамі яе неабходна дадаваць. Для абароны цыбулін ад загнівання перыядычна пакідаць іх без вады на 3-4 дні. Яшчэ лепш прыкрыць скрыню вечкам з алюмінію ці кардону, апрацаванага ў растопленым парафіне. У адтуліны вечка выкласці цыбуліны. Гэта засцеражэ іх ад загнівання, пазбавіць ад паху ў пакоі. Для выганкі зеляніны прыдатныя і розныя пластыкавыя ёмістасці з-пад малочных прадуктаў, але карыстацца імі не вельмі эстэтычна.

Зялёную цыбулю атрымліваюць яшчэ з дзёранак шматгадовых цыбулінак — слізуна, батуна, шмат'ярусная, шніта. Для гэтага іх нарыхтоўваюць з восені пры прарэджванні градак, захоўваюць у скляпах. Узімку ўкладваюць у дробныя скрыні ці бляхі, пасыпаюць зверху перагноем і злёгку паліваюць.

## СЁННЯ

### Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 9.16 | 17.25 | 8.09 |
| Віцебск — | 9.12 | 17.09 | 7.57 |
| Магілёў — | 9.06 | 17.15 | 8.09 |
| Гомель — | 8.56 | 17.19 | 8.23 |
| Гродна — | 9.30 | 17.42 | 8.12 |
| Брэст — | 9.24 | 17.49 | 8.25 |

### Месяц

*Апошняя квадра 15 студзеня.*
*Месяц у сузор'і Стральца.*

### Імяніны

*Пр.* ХРЫШЧЭННЕ ГАСПОДНЯЕ, ці СВЯТОЕ БОГАЯЎЛЕННЕ.
*К. Браніслава, Генрыха, Марты, Сары, Юзафа.*



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

## ЗАЎТРА




## Даты | Падзеі | Людзі

**19 СТУДЗЕНЯ**

**У краіне**

**1838** год — пачала выдавацца газета «Гродненские губернские ведомости», першае перыядычнае друкаванае выданне на тэрыторыі Беларусі. Мела афіцыйную і неафіцыйную часткі. У афіцыйнай часткі друкаваліся пастановы і распараджэнні цэнтральных і мясцовых улад. Неафіцыйная частка асвятляла грамадска-палітычнае і культурнае жыццё краю, публікавала гісторыка-краязнаўчыя матэрыялы, артыкулы па пытаннях асветы, сельскай гаспадаркі, карэспандэнцыі з гарадоў і вёсак губерні, інфармавала пра знамянальныя падзеі і факты мясцовага жыцця. Газета мела сваіх рэпарцёраў у Беластоку, Брэсце, Слоніме і іншых гарадах. Сярод яе аўтараў — А. Багдановіч, М. Дзмітрыеў, М. Доўнар-Запольскі і іншыя. Газета выдавалася па 13 жніўня 1915 года.

**1923** год — нарадзіўся Аляксей Ільіч Данілаў, Герой Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную вайну на фронце з 1944 года. Вызначыўся 30 чэрвеня 1944 года пры вызваленні г. Барысава. Экіпаж яго танка прарваўся праз раку Бярэзіну ў заняты ворагам горад і 17 гадзін у адзіночку вёў бой, разграміўшы варожую камендатуру, штаб, падбіўшы два варожыя танкі.

**1940** год — нарадзіўся Уладзімір Агабекаў, вучоны-хімік, акадэмік НАН Беларусі, доктар хімічных навук, прафесар, заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь. Аўтар больш за 900 навуковых прац, у тым ліку чатырох манаграфій. Атрымаў 110 аўтарскіх пасведчанняў і патэнтаў на вынаходніцтвы. З 1999 года — дырэктар Інстытута хіміі новых матэрыялаў НАН Беларусі. Навуковыя працы ў галіне фізічнай хіміі. Распрацаваў прынцыпова новыя фота- і электранарэзісты для працэсаў сухой вакуумнай літаграфіі і іншае. Тэарэтычныя распрацоўкі вучонага ляглі ў аснову стварэння шэрагу тэхналогій атрымання малатаннажных хімічных прадуктаў рознага функцыянальнага прызначэння для прадпрыемстваў Мінпрама, Белнафтахіма, Дзяржзнака, Беллеспаперапрама і іншых галін вытворчасці.

**У свеце**

**1419** — у ходзе Стогадовай вайны паміж Англіяй і Францыяй англійскі кароль Генрых V акружыў французскі горад Руан, што паклала канец заваяванню Нармандыі.

**1809** год — нарадзіўся Эдгар Алан По, амерыканскі пісьменнік, паэт, эсэіст, літаратурны крытык, прадстаўнік рамантызму. Стваральнік формы класічнага дэтэктыва і жанру псіхалагічнай прозы. Некаторыя творы Эдгара По спрыялі фарміраванню і развіццю навуковай фантастыкі, а такія рысы яго творчасці, як ірацыянальнасць, містыцызм, асуджанасць, анамальнасць адлюстраваных станаў, папярэднічалі літаратуры дэкадэнцтва. Найбольш вядомы як аўтар «страшных» і містычных апавяданняў. Эдгар По быў адным з першых пісьменнікаў, якія зрабілі навелу асноўнай формай сваёй творчасці.

**1865** год — нарадзіўся Валянцін Аляксандравіч Сяроў, рускі жывапісец, партрэтыст. Член Таварыства перасоўных мастацкіх выставак, член аб'яднання «Свет мастацтва», правадзейны член Акадэміі мастацтваў. Выкладаў у Маскоўскім вучылішчы жывапісу, разьбярства і дойлідства. Аўтар карцін «Дзяўчынка з персікамі», «Дзяўчына, асветленая сонцам», «Выкраданне Еўропы» і іншых. Яго пэндзлю належыць шырокая галерэя партрэтаў вядомых дзеячаў мастацтва, сярод якіх — Ф. І. Шаляпін, К. С. Станіслаўскі, М. М. Ярмолава, І. І. Левітан, А. М. Горкі.

**1903** год — аб'яўлена аб правядзенні першай велагонкі «Тур дэ Франс» — аднаго з самых прэстыжных і папулярных спаборніцтваў нашых дзён.



**Так гаварылі...**

**АЛЕСЬ ГАРУН:**

*«Дык шануй, беларус, сваю мову —*
*Гэта скарб нам на вечныя годы;*
*За пашану радзімаму слову,*
*Ушануюць нас брацця-народы!»*

## УСМІХНЕМСЯ

**— Ганна, куды дзелася бутэлька гарэлкі?**
**— Я апрацоўвала рану.**
**— Якую яшчэ рану?**
**— Душэўную!**

Дзяўчына паркуе машыну. Здае наперад — бах, потым здае назад — зноў удар. Падыходзіць даішнік і кажа:
— Мадам, паркуемся на слых?

**Пятніца!!! Трымаю сябе ў руках, але думаю, што да вечара вырвуся!**

Прачытаў, што большасць таленавітых людзей гультаяватыя. Сумневы ўбок, я — талент.

**Вельмі хутка прыбіраецца той, у каго маці праз гадзіну будзе дома.**




ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by

(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета адрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, прасп. Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 12.768. Індэкс 63850. Зак. № 61.

Нумар падпісаны ў 19.30 18 студзеня 2023 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12